

ПА ПЕСНІ ПАЗНАЕЦЦА НАЦЫЯ, ЯЕ ХАРАКТАР І ДУША 8

ПРАВІЛЬНАЕ ХАРЧАВАННЕ ПРЫ COVID-19 9



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 ЛЮТАГА 2022 г. СЕРАДА № 21 (29643)

# Энергія і птушкі

BEIJING 2022

***Членам дэлегацыі Рэспублікі Беларусь на XXIV зімовых Алімпійскіх гульнях у г. Пекіне (Кітай)***

Дарагія сябры!

Лічаныя дні застаюцца да пачатку зімовай Алімпіяды 2022 года ў Пекіне, якую з нецярпеннем чакае ўвесь свет.

Мара кожнага спартсмена і трэнера — п'едэстал Алімпійскіх гульняў, але вяршыня скараецца толькі тым, хто ўпарта працуе і цвёрда верыць у сябе.

Перад вамі стаіць важная і адказная задача. Трэба выкласціся па максімуме і прадэманстраваць усяму свету, што беларусы ўмеюць перамагаць. Умеюць змагацца прыгожа, сумленна і годна, паважаючы сапернікаў і з гонарам праслаўляючы Радзіму.

Веру ў нашу каманду і ў кожнага з вас.

Памятайце, уся краіна хварэе за алімпійцаў і жадае спартыўных подзвігаў у імя Беларусі.

Няхай вам спадарожнічае поспех на снежных стадыёнах і лядовых арэнах алімпійскага Пекіна і здзяйсняюцца самыя смелыя мары!

Жадаю моцнага здароўя, стойкасці і ўдачы.

**Аляксандр ЛУКАШЭНКА,**
**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У машыніста турбіннага цэха Лукомльскай электрастанцыі Віталя КАШЧЭЕВА зімовы сезон — асаблівы ў жыцці, адказны, бо заўсёды насычаны клопатамі пра братоў нашых меншых. Віталь — заўзяты аматар птушак, ён назірае за іх паводзінамі і міграцыяй, у прыватнасці, тых, якія гняздуюцца на ўзбярэжжы Лукомльскага возера. Але не толькі глядзіць — у сцюжу вывешвае кармушкі, падсыпае корм. А яшчэ фатаграфуе. І, што вельмі важна, акальцоўвае іх. Зіма — якраз зручны час тое рабіць, асабліва для беласнежных лебедзяў, якія зімуюць на азёрнай акваторыі. У зімні перыяд жыхар Новалукомля назапашвае багаты арніталагічны матэрыял, якім дзеліцца з заолагамі Акадэміі навук. Нядаўна і мне ўдалося пабываць з апантаным аматарам прыроды ў так званай экспедыцыі па кальцаванні каралеўскай птушкі. А сённяшні дзень, дарэчы, пазначаны як сусветны дзень водна-балотных угоддзяў. Лукомльскае возера таксама адносіцца да такіх важных экалагічных мясцін, а герой нашага аповеда — Віталь Кашчэеў — шчыры прыхільнік здаровай экалогіі, а значыць, і сапраўдны захавальнік знакамітага возера.

СТАР. 13

## КОРАТКА

• На пенсіённае забеспячэнне беларусаў у 2022 годзе запланавана Br16 млрд, паведаміла міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына Касцевіч. Гэта 9 % валавога ўнутранага прадукту, што сёння супастаўна з іншымі краінамі свету.

• Знешні дзяржаўны доўг па стане на 1 студзеня 2022 года склаў $18,2 млрд і зменшыўся з пачатку года на $0,4 млрд (з улікам курсавых розніц), або на 1,9 працэнта.

ISSN 1990 — 763X

Па палічках

## І яшчэ пра падатковыя нюансы

**Галоўнае, каб кватэра належала пенсіянеру, а хто там яшчэ зарэгістраваны — не мае значэння**



**У пачатку года кіраўнік дзяржавы падпісаў Закон «Аб змяненні законаў па пытаннях падаткаабкладання». Як адзначаюць многія спецыялісты, карэкціроўка Падатковага кодэкса арыентавана на вырашэнне практычных пытанняў падаткаабкладання. Мы дэталёва разабраліся, каго менавіта закранулі гэтыя змяненні.**

СТАР. 4




## ЯК НЕ СТАЦЬ АХВЯРАЙ ВОГНЕННАЙ СТЫХІІ?

**Адна з асноўных прычын пажараў з трагічным фіналам — неасцярожнасць з агнём падчас курэння**



Фота прэс-службы МНС.

**Не паспеў пачацца год, як ратавальнікі б'юць трывогу: адзін за адным у розных рэгіёнах краіны ўспыхваюць пажары, на якіх гінуць людзі. Прычым у многіх выпадках — ды практычна ва ўсіх! — трагедыі можна было б пазбегнуць, каб жыхары прытрымліваліся элементарных правілаў бяспекі: не курылі ў хаце, не выпівалі пры гэтым, правільна палілі ў сваіх печах і сачылі за іх станам.**

### АХВЯРЫ АГНЮ

Ужо ў першы дзень новага года ратавальнікам паступіла паведамленне аб узгаранні кватэры ў Дзяржынску. Супрацоўнікі МНС, якія аператы́ўна прыбылі на месца здарэння, выявілі, што пажар узнік на першым паверсе. Дым хутка распаўсюджваўся па лесвічнай клетцы на іншыя паверхі пяціпавярховіка.

СТАР. 5

З першых вуснаў

# «МЫ ВЕЛЬМІ ЦЭНІМ І БЕРАЖЛІВА СТАВІМСЯ ДА НАШЫХ УЗАЕМААДНОСІН»

### Прэзідэнт Беларусі сустрэўся з губернатарам Санкт-Пецярбурга Аляксандрам Бягловым

**Нягледзячы на пандэмію, аднаўляюцца традыцыйныя сустрэчы беларускіх улад з прадстаўнікамі расійскіх рэгіёнаў. Такія візіты на працягу апошніх пяці гадоў зарэкамендавалі сябе як нагода для росту эканамічных адносін, і ўзаемадзеянне рэгіёнаў стала лакаматывам супрацоўніцтва ў Саюзнай дзяржаве. Нягледзячы на тое, што слова «лакаматыў» у дачыненні да партнёрства рэгіёнаў стала збітым журналісцкім штампам, узаемадзеянне Беларусі з Паўночнай сталіцай Расіі паказвае прыклад для многіх і заахвочвае да такога ж паказчыка. У апошні перадпандэмійны 2019 год бакі ажыццявілі гандаль на 1,75 мільярда долараў, а ў крызісным 2020-м праселі не так значна. Летась увогуле пачалі аднаўляць ранейшыя аб'ёмы, як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, «добрымі тэмпамі».**

## Пра сумесную гісторыю...

Візіты дэлегацый з рэгіёнаў Расіі ў Беларусь заўсёды напоўнены значным эканамічным сэнсам — перагаворы ва ўрадзе, на прадпрыемствах. Але падчас гэтага візіту рабілі акцэнт на гуманітарным блоку. Тут ці трапна супалі даты — 27 студзеня адзначылі 78-ю гадавіну вызвалення блакаднага Ленінграда, ці расіяне вырашылі прычыніцца да Года гістарычнай памяці ў Беларусі, але пасля перагавораў у Палацы Незалежнасці Аляксандр Бяглоў узяў удзел у адкрыцці сумеснай экспазіцыі ў музеі ВАВ «Сімвалы блакаднага Ленінграда» і сустрэчы з жывымі сведкамі гэтай падзеі. На сёння запланавана яго знаёмства з Храмам-помнікам у гонар Усіх Святых і іншымі святынямі беларускай сталіцы.

Не абмінуў такую сімвалічнасць у сваім прывітальным слове і Прэзідэнт. «Сённяшні візіт вызначае важныя гуманітарныя, гістарычныя акцэнты. Я з гэтага хацеў бы пачаць, хоць звычайна мы гаворым пра эканоміку, гандаль. Удзячны вам за тое, што ў цяперашняй няпростай сітуацыі вы выбралі вельмі знакавы момант для наведвання Беларусі. Вы, як ніхто іншы, добра ведаеце, як беражліва захоўваем і ў Піцеры, і ў Беларусі гісторыю Вялікай Айчыннай вайны», — сказаў кіраўнік краіны.

«27 студзеня пецярбуржцы адзначылі 78-ю гадавіну вызвалення Ленінграда ад фашысцкай блакады. Адкрыццё сумеснай экспазіцыі «Сімвалы блакаднага Ленінграда» ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, — правільная і важная ініцыятыва», — дадаў беларускі лідар.

## ...і сучаснае эканамічнае партнёрства

Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, 2021 год паказаў: эканамічнае ўзаемадзеянне Беларусі з Санкт-Пецярбургам аднаўляецца добрымі тэмпамі. За 11 месяцаў мінулага года перасягнулі аб'ём тавараабароту 2020 года — і 1,7 мільярда долараў (як было да пачатку пандэміі) амаль дасягнулі летась.

«Сумесныя праекты, апроч непасрэднага прызначэння, маюць значны іміджавы эфект. Трэба на працягу найбліжэйшых гадоў паспяхова завяршыць будаўніцтва некаторых аб'ектаў. Здача першых аб'ектаў Санкт-пецярбургскага квартала ў Мінску запланавана на ліпень 2022 года. Я думаю, справімся», — мяркуе Прэзідэнт.

Па словах Прэзідэнта, яму вядома, што ўлады Санкт-Пецярбурга робяць акцэнт на экалагічнай тэматыцы. Таму прапаноўвае пецярбуржцам беларускія аўтобусы на газаматорным паліве. Да ліпеня амаль 900 аўтобусаў сярэдняй і вялікай умяшчальнасці на звадкаваным газе Мінскага аўтамабільнага завода пачнуць хадзіць па вуліцах Піцера.

«Мы свае абавязацельствы выканаем. Нават не сумнявайцеся. Мы вельмі цэнім і беражліва ставімся да нашых узаемаадносін. Асабліва ў сферы паставак, гандлю, таму што ў нас экспартна арыентаваная эканоміка. Нікуды ад гэтага не сысці», — падзяліўся кіраўнік беларускай дзяржавы.

Наступны этап для горада на Няве — пашырэнне прымянення электратранспарту. Мінску як экспарцёру тут пашчасціла. Прэзідэнт прапануе электрычны транспарт Санкт-Пецярбургу. Так, спецыялізаванае прадпрыемства «Белкамунмаш» на працягу двух гадоў павінна паставіць у Санкт-Пецярбург амаль 100 тралейбусаў з павялічаным аўтаномным ходам. Нядрэнна зарэкамендавалі сябе ў Расіі, заўважае Прэзідэнт, трамваі швейцарскай кампаніі «Штадлер», якія вырабляюцца ў Беларусі.

Яшчэ адзін кірунак прамысловага супрацоўніцтва — ліфты. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, многія з іх на постсавецкай прасторы засталіся яшчэ з савецкіх часоў, і іх неабходна мяняць. «Мы і ў сябе вялікую праграму рэалізоўваем, і на постсавецкай прасторы амаль у кожную рэспубліку пастаўляем гэтыя ліфты. У нас з вамі зборачнае прадпрыемства, таму трэба нам развіваць гэтыя адносіны. Праз Піцер можам супрацоўнічаць з усімі паўночнымі рэгіёнамі», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. У ліпені 2019 года ў Санкт-Пецярбургу пачала работу зборачная лінія ліфтаў ААТ «Магілёўліфтмаш» на пляцоўцы сумеснага прадпрыемства ТАА «Неўскі ліфт».

Падзякаваў Прэзідэнт дэлегацыі за інтарэс да беларускіх прадуктаў харчавання: «Я вам гарантую, што вы ніколі не пашкадуеце, што купляеце беларускія прадукты. Мы заўсёды патрабавальныя да якасці. Мы захавалі дзяржаўныя стандарты з тых часоў. Тут нас Чарнобыль падштурхнуў да гэтага. Таму ў нас якасная прадукцыя і напаўняльнікаў там няма».

**У канцы размовы Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, чаму ў яго да Санкт-Пецярбурга асаблівае стаўленне.**

*«У мяне ёсць формула. У апошнюю вайну больш за ўсё цярпелі Ленінград і Беларусь. Я як гісторык займаўся гэтым, вывучаў. І я раблю выснову, што ленінградцы, піцерцы, беларусы — людзі і ментальна, і вонкава вельмі падобныя. Я схіляюся перад ленінградцамі: калі разруха была поўная, Беларусь амаль сцерлі з зямлі, бедныя, абяздоленыя, ледзь жывыя ленінградцы (ад вучоных да будаўнікоў) прыехалі да нас аднаўляць Мінск і Беларусь. Таму Піцер, Ленінград я часта называю нашым, беларускім»,* — дадаў Прэзідэнт.

І гэтыя сувязі з даўніх часоў, па яго словах, сталі базісам, на якім выбудоўваюцца эканамічныя адносіны сёння.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### Каментарый у тэму



**Аляксандр БЯГЛОЎ, губернатар Санкт-Пецярбурга,** пачаў размову з журналістамі пасля сустрэчы са сваіх уражанняў ад Паслання Прэзідэнта да беларускага народа і парламента. На яго думку, яно было вельмі шчырым і змястоўным.

«Вельмі важныя словы былі сказаны пра незалежнасць. Гэта для мяне і маіх калег сведчыць, што падыход да развіцця Рэспублікі Беларусь эвалюцыйны, а не рэвалюцыйны. Гэта ўразіла мяне», — падзяліўся суразмоўнік.

Пасля ён працягнуў, што візіт у Беларусь звязаны з датай вызвалення Ленінграда ад блакады — 27 студзеня 1944 года. «Мы прывезлі ў ваш Музей Вялікай Айчыннай вайны шэраг экспанатаў. Сёння будзе адкрыццё адмысловай выстаўкі, пасля частка экспанатаў будзе пакінутая ў вас. У нас было адно гора, адна вайна, але і адна Перамога. Сёння Прэзідэнт Беларусі дакладна абазначыў, што гэта былі вельмі трагічныя моманты як для Беларусі, так і для Ленінграда», — сказаў губернатар.

Падзяліўся Аляксандр Бяглоў сваімі думкамі наконт эканамічнага ўзаемадзеяння Беларусі і горада на Няве. «Што датычыцца пасажырскага грамадскага транспарту — ужо 400 аўтобусаў МАЗ курсіруюць у Санкт-Пецярбургу. Ужо закупілі каля 150 тралейбусаў. Сёння размова ішла пра электробусы. Мы будуем новы парк электробусаў, таму вядуцца перагаворы наконт закупкі на беларускіх прадпрыемствах», — паведаміў пра планы губернатар.

Аляксандр Бяглоў расказаў журналістам, што беларуская харчовая прадукцыя карыстаецца вялікім попытам у яго суайчыннікаў, ды і сам ён — яе аматар.

Яшчэ адна тэма для абмеркавання — гуманітарныя кантакты. Сёння ў Санкт-Пецярбургу вучацца 2400 беларускіх студэнтаў, 350 — атрымліваюць прафесійную адукацыю. «Дамовіліся, што будзем павялічваць колькасць вучняў у нашых ВНУ. Асаблівую ўвагу Прэзідэнт удзяліў нашаму навуковаму ўзаемадзеянню. Што датычыцца акадэмічных і прыкладных навук, трэба ўмець атрымліваць новыя веды і выкарыстоўваць іх на карысць двух нашых народаў», — сказаў Аляксандр Бяглоў.

## Абмяркоўваем Пасланне Прэзідэнта

**Таццяна РУНЕЦ:**

# «БЕЗ МОЦНАЙ ЭКАНОМІКІ НЕ БУДЗЕ БЕЛАРУСІ»

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:**



— Штогадовае Пасланне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі да беларускага народа і парламента заўсёды становіцца вялікай палітычнай падзеяй у жыцці краіны і нікога не пакідае абыякавым. Цяперашні зварот адрознівае не толькі новы фармат, але і адрасаваныя ўсім нам, жыхарам Беларусі, актуальныя пытанні, якія датычацца захавання суверэнітэту і незалежнасці нашай дзяржавы. Немалаважна, што ў Пасланні зроблены акцэнт і на такіх значных кірунках, як падтрымка дзяржавай шматдзетных сем'яў і моладзі, прадастаўленне працоўным грамадзянам пры праходжанні імі абавязковай дыспансерызацыі аднаго аплачваемага дня ў годзе і, вядома ж, захаванне гістарычнай памяці аб подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Хацелася б адзначыць, што непасрэдна мяне як старшыню профільнай камісіі Савета Рэспублікі больш за ўсё хвалявала тэма захавання эканамічнага суверэнітэту Беларусі. І тут давялося пачуць галоўныя пасылы: максімальнае стрымліванне неабгрунтаванага росту цэн на спажывецкім рынку і мінімізацыя ўплыву сусветных інфляцыйных працэсаў на эканоміку нашай краіны.

У сваім Пасланні Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на правільным выкарыстанні экспартнага патэнцыялу Беларусі, разумным удзеле дзяржавы ў рэгуляванні эканомікі, справядлівасці размеркавання выгод. Цалкам пагаджуся са словамі нашага лідара, што без моцнай эканомікі не будзе Беларусі. Бо менавіта дзякуючы эканамічнай палітыцы, якая правільна праводзіцца на фоне імклівага росту сусветных цэн і стагнацыйных чаканняў, а таксама агрэсіўнай санкцыйнай палітыкі калектыўнага Захаду ў дачыненні да Беларусі, нам удалося не толькі захаваць рэальны рост заработнай платы на ўзроўні амаль у 105 %, не згарнуўшы пры гэтым ніводнай сацыяльнай праграмы, але і нарасціць будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай больш чым на 14 %.

Лічу, што задачы, якія паставіў Прэзідэнт, цалкам апраўданыя і рэальныя. Бо беларускі народ — гэта прыклад працавітасці і мэтанакіраванасці, здольнасці ў адзіным парыве пераадольваць любыя цяжкасці і нягоды. І, напэўна, менавіта ў гэтым кіраванні сваім шляхам і заключаецца наша беларуская стратэгія развіцця.

**Запісала Вольга АНУФРЫЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Надзвычайнае становішча ў М'янме працягваецца яшчэ на паўгода



Ваенныя ўлады М'янмы прынялі рашэнне прадоўжыць рэжым надзвычайнага становішча ў краіне на шэсць месяцаў, паведаміла ТАСС. Паводле інфармацыі мясцовых СМІ, усе члены Савета нацыянальнай абароны і бяспекі, у тым ліку часовага прэзідэнта краіны, аднагалосна прынялі рашэнне аб прадаўжэнні перыяду надзвычайнага становішча па ўсёй краіне. Летась 1 лютага ваенная камандаванне М'янмы аб'явіла аб увядзенні на год надзвычайнага становішча і зняцці грамадзянскага кіраўніцтва краіны. Прадстаўнікі арміі растлумачылі гэта маштабнымі фальсіфікацыямі, якія, паводле іх меркавання, адбыліся на агульных парламенцкіх выбарах, што прайшлі ў лістападзе 2020-га.

### Данія першай у Еўрасаюзе адмяніла ўсе COVID-абмежаванні



Цяпер у гэтай краіне перастануць быць абавязковымі маскі і COVID-пашпарты, а час работы бараў і рэстаранаў больш не будзе абмежаваны. Таксама зноў адкрываюцца начныя клубы, адменены ліміт на колькасць людзей у зачыненых памяшканнях. Пры гэтым захаваюцца некаторыя абмежаванні для тых, хто прыбывае ў краіну, у прыватнасці для невакцынаваных турыстаў з краін, якія не ўваходзяць у шэнгенскую зону. Абмежаванні адменены, нягледзячы на высокія паказчыкі заражэння каранавірусам. У Даніі больш за 80 % насельніцтва атрымала абедзве дозы вакцыны ад віруса і каля 60 % атрымала бустарную дозу. Прапанова адмяніць усе абмежаванні паступіла ад міністэрства аховы здароўя на мінулым тыдні і пазней была зацверджана парламентам.

### Наймацнейшыя за 120 гадоў дажджы абрынуліся на паўночны захад Аўстраліі



У акрузе Кімберлі выпала беспрэцэдэнтная за апошнія 120 гадоў колькасць ападкаў. Аб гэтым паведаміў мясцовы тэлеканал «9 News». Мусонныя дажджы, якія не спыняюцца ў рэгіёне ўжо некалькі дзён, прывялі да затаплення населеных пунктаў і дарожнай інфраструктуры. Так, у раёне міжнароднага аэрапорта ў аўстралійскім Бруме за 48 гадзін выпала 563 міліметры ападкаў — гэта больш, чым за ўвесь мінулы год. Сіноптыкі прагназуюць, што ў найбліжэйшыя дні залевы працягнуцца. Таксама чакаецца моцны вецер з парывамі да 100 кіламетраў у гадзіну.

# ХТО АЭС «НАРАДЗІЎ», ТОЙ ЗА ЯЕ І АДКАЗВАЕ

## Атамнае супрацоўніцтва і ядзерна-электрычная будучыня

**Сёлета Беларусь стала атамнай дзяржавай, таму не дзіва, што ў галоўны дакумент краіны, прапановы па змяненнях у які вынесены на рэферэндум, дададзена навела «Рэспубліка Беларусь развівае атамную энергетыку ў мірных мэтах, забяспечвае бяспеку пры вытворчасці і выкарыстанні атамнай энергіі». Першы энергаблок з моманту падключэння да аб'яднанай энергасістэмы краіны выпрацаваў ужо 6,9 млрд кВт·г, што дазволіла сэканоміць на замяшчэнні імпарту прыроднага газу каля 250 млн долараў. З запускам двух энергаблокаў Беларусь зможа замяшчаць каля 4,5 млрд м³ газу на год. У рэактар другога энергаблока, які гатовы на 95 %, ужо загружаны цеплавыдзяляльныя зборкі (ЦВЗ). Налета плануюцца яго энергетычны пуск і падключэнне да энергасістэмы краіны. Калі станцыя выйдзе на намінальную магутнасць, яна будзе генерыраваць каля 40 % усёй электраэнергіі Беларусі і штогод выпрацоўваць каля 18,5 млрд кВт·г.**



### Місіі выкананы

За час будаўніцтва атамнай станцыі ў Беларусь прайшлі ўсе місіі, якія МАГАТЭ рэкамендуе краінам-навічкам у галіне ядзернай энергетыкі, а міжнароднае супрацоўніцтва краіны ў галіне ядзернай і радыяцыйнай бяспекі працягваецца, запэўнілі эксперты. Міжнародныя мерапрыемствы, у тым ліку навучальныя, па лініі МАГАТЭ і Еўрапейскага саюза не спыніліся, а ў некаторай частцы яны нават ідэнтыфікаваліся, пакольку былі пераведзены ў віртуальны фармат праз умовы пандэміі. У канцы верасня Беларусь, дарэчы, удзельнічала ў генеральнай канферэнцыі МАГАТЭ, дзе прайшоў шэраг двухбаковых сустрэч з рэгулюючымі органамі Расіі, Венгрыі, Турцыі, прадстаўнікамі МАГАТЭ, еўрапейскай камісіі, расказала **Наталля ДАНІЛЕНКА, начальнік аддзела міжнароднага супрацоўніцтва Дзяржатамнагляда:**

— Вынікі місій на БелАЭС становяцца асновай для распрацоўкі нацыянальных планаў дзеянняў, якія скіраваны на ўдасканаленне ядзернай і радыяцыйнай бяспекі. У 2016 годзе ў краіне працавала місія па комплекснай ацэнцы рэгулюючай інфраструктуры (IRRS), у 2018-м — місія па аварыйнай гатоўнасці і рэагаванні (EPREV), у 2019-м — місія па ўліку і кантролю ядзерных матэрыялаў (ISSAS). Мы таксама ўзялі ўдзел у правядзенні місіі па комплекснай ацэнцы ядзернай інфраструктуры (INIR) у дзвюх яе фазах (2012 і 2020 гады). Місія INIR ацэньвае стан інфраструктуры ў цэлым і ўтрымлівае 19 модуляў, большая частка з якіх закранае пытанні рэгулявання ядзернай і радыяцыйнай бяспекі. Сёлета ў Беларусі ўжо прайшла місія па пытаннях фізічнай абароны (IPPAS) і постмісія па комплекснай ацэнцы рэгулюючай інфраструктуры ядзернай і радыяцыйнай бяспекі (IRRS).

Задача экспертаў МАГАТЭ была не нанава ацэньваць сістэму рэгулявання па тэматычных модулях, а паглядзець, якога прагрэсу дасягнула краіна пры выкананні рэкамендацый місіі і як рэалізоўваецца нацыянальны план дзеянняў. У снежні адбылася таксама передпускавая партнёрская праверка другога энергаблока экспертамі Маскоўскага цэнтра Сусветнай асацыяцыі арганізацый (САА), якія эксплуатуюць атамныя электрастанцыі.

### Партнёрскі агляд і справаздача

Беларусь таксама цесна ўзаемадзейнічае з еўрапейскай групай рэгулюючых органаў ядзернай бяспекі ENSREG. Супрацоўніцтва найперш адбываецца па пытаннях стрэс-тэстаў БелАЭС. Такое паняцце і неабходнасць праверкі ўстойлівасці ўсіх атамных станцый да прыродных уздзеянняў узнікла пасля таго, як у сакавіку 2011 года землятрус і цунамі прывялі да аварыі на АЭС Фукусіма-даіці ў Японіі, нагадаў **Алег СОБАЛЕЎ, кансультант Дзяржатамнагляда:**

— Першым этапам стрэс-тэстаў у 2016 годзе стала самаацэнка, якую правяла станцыя з удзелам расійскіх партнёраў. Другім (у 2017-м) — нацыянальная ацэнка па даручэнні ўрада пад агульным кіраўніцтвам Дзяржатамнагляда. Трэцім (канец 2017-га — сярэдзіна 2018-га) — партнёрская праверка экспертнай групы ENSREG. Па выніках гэтага ў 2019-м быў выпрацаваны нацыянальны план дзеянняў, скіраваны на павышэнне запасаў бяспекі БелАЭС над устаноўленымі патрабаваннямі.

З канца мінулага года і сёлета ENSREG сумесна з Дзяржатамнаглядам праводзіць партнёрскі агляд ужо нацыянальнага плана Беларусі. Гэта не паўторная ацэнка ці стрэс-тэсты. Еўрапейскія эксперты глядзяць, наколькі краіна ўлічыла ў нацыянальным плане рэкамендацыі ENSREG, якія былі дадзены ў 2018-м. Такім чынам і выконваецца нацыянальны план, растлумачыў эксперт:

— Партнёрскі агляд уключае два этапы. Першы адбыўся ў лютым 2021-га, калі эксперты разглядалі сем прыярытэтных пытанняў, якія, на іх думку, было важна прааналізаваць да ўводу першага энергаблоку БелАЭС у эксплуатацыю. Прадстаўнікі ENSREG адзначылі, што Беларусь належным чынам адрэагавала на рэкамендацыі і рэалізавала мерапрыемствы, якія адпавядаюць сямі абазначаным прыярытэтным пытанням. У межах другога этапу партнёрскага агляду эксперты наведалі пляцоўку атамнай станцыі, убачылі больш за 70 аб'ектаў і сістэм АЭС, у тым ліку рэактарнае аддзяленне, вывучылі мноства дакументацыі і мелі магчымасць абмеркаваць усе пытанні з прадстаўнікамі БелАЭС і расійскім бокам.

Вынікам агляду стала канчатковая справаздача ENSREG, якая была разгледжана на пасяджэнні еўрапейскай групы рэгулюючых органаў ядзернай бяспекі. Дакумент апублікаваны на сайце Дзяржатамнагляда для агульнага доступу, гэтак жа як і прэс-рэліз наглядная органа.

— Прадстаўнікі ENSREG у справаздачы канстатавалі адкрытасць і празрыстасць дзеянняў беларускага боку. Яны адзначылі, што ўсе рэкамендацыі выкананы і ўлічаны, а дзеянні на АЭС адпавядаюць духу і літары іх рэкамендацый. Узровень запасу бяспекі атамнай станцыі ацэнены як той, што перавышае нормы, а прынцып бесперапыннага павышэння бяспекі, які практыкуе МАГАТЭ, падтрымліваецца беларускім бокам. З 22 рэкамендацый выканана ўжо 17 (прычым многія — з апярэджаннем тэрмінаў). Пяць — у стадыі выканання, — удакладніў эксперт.

Акрамя таго, з улікам павышанай цікавасці да мерапрыемстваў, што адбываюцца па выніках стрэс-тэстаў, у лістападзе быў актуалізаваны і апублікаваны на сайце Дзяржатамнагляда статус выканання мерапрыемстваў нацыянальнага плана. А таксама сам нацплан, у які дадалі некалькі пунктаў.

Эксперты нагадалі, што досыць доўгае спыненне першага энергаблока БелАЭС, які цяпер ізноў эксплуатуецца, не адбілася на бяспецы атамнай станцыі.

— Сітуацыя з рамонтам зацягнулася ў тым ліку таму, што дэталі для атамнай станцыі — гэта не масавая, а штучная вытворчасць. Прыйшлося чакаць, пакуль выраб'яць патрэбнае абсталяванне. Калі нешта псуецца ў замежным аўто, то запчасці да яго не робяць у краіне, якая яго купіла, новыя дэталі чакаюць ад вытворцы, — паясніў Алег Собалеў. — У Беларусі цесныя сувязі не толькі па лініі эксплуатуючай арганізацыі, але і па лініі рэгулюючага органа з краінай — пастаўшчыком ядзерных тэхналогій у нашу краіну — Расіяй. Гэта нармальная сусветная практыка, што краіна — пастаўшчык тэхналогій працуе з аб'ектамі ў розных краінах дзесяцігоддзямі. Гэта як дзіця: хто яго нарадзіў, той і нясе за яго адказнасць.

### Больш лічыльнікаў, менш газу

За час работы першага энергаблока аб'ём электраспажывання ў краіне вырас амаль да 26,5 млрд кВт·г, а аб'ём спажывання насельніцтвам склаў 225 млн кВт·г. Яшчэ 500 млн кВт·г ужывае энергасістэма, у тым ліку для забеспячэння работы электракатлоў. БелАЭС для Беларусі — гэта не толькі гарант павышэння энергетычнай бяспекі, але і якасна новыя магчымасці для развіцця нацыянальнай эканомікі, самыя перадавыя тэхналогіі, тысячы новых рабочых месцаў, абазначыў **міністр энергетыкі Віктар КАРАНКЕВІЧ:**

— З запускам двух блокаў АЭС краіна атрымае не толькі надзейную экалагічную крыніцу энергіі, якая забяспечыць каля 40 % унутраных патрэб у электраэнергіі, але і штогод будзе змяншаць выкіды парніковых газаў больш як на 7 млн тон, спрыяючы змякчэнню наступстваў змянення клімату.

Энергетыкі плануюць таксама знізіць долю выкарыстання газу ў вытворчасці цеплавой і электрычнай энергіі да 60 % у 2025-м і да 50 % — у 2030-м. Акрамя таго, мяркуецца павялічыць колькасць аднаўляльных крыніц энергіі ў агульным аб'ёме паліўна-энергетычных рэсурсаў да 7 % у 2025-м і да 8 % — у 2030-м. Усё гэта дазволіць сэканоміць за пяцігодку каля 310 тысяч тон у. п.

Сярод надаўніх дасягненняў айчыннай энергасістэмы — з'яўленне цалкам лічбавай падстанцыі класа напружання 330 кВ «Магілёў-330». Гэта адна з базавых падстанцый у энергасістэме, дзе выкарыстоўваюцца найноўшыя тэхналогіі збору і перадачы інфармацыі, лічбавыя трансфарматары току і напружання, аптычныя кабельныя сувязі паміж рознымі прыладамі, паведаміў кіраўнік Мінэнерга.

— Укараненне лічбавых тэхналогій на аб'екце дазволіла значна знізіць эксплуатацыйныя і працоўныя затраты і павысіць надзейнасць электразабеспячэння. У рамках праекта на лініях электраперадачы ўпершыню выкарыстаны прылады вызначэння месца пашкоджання, якія працуюць па хвалевым прынцыпе. Яны дазваляюць з высокай верагоднасцю (да некалькіх дзясяткаў метраў) знайсці месца здарэння.

Працягваецца работа і па ўкараненні электронных лічыльнікаў электраэнергіі. За 2016—2021 гады ўстаноўлена 2,5 млн такіх прылад, за 2021-ы — заменена 458,3 тысячы прылад уліку ў жыхароў. 1,8 млн абанентаў (электронных лічыльнікаў) ужо аб'яднаны ў аўтаматызаваную сістэму «АСКУЭ-быт». Знаходжанне ў ёй дазваляе разлічваць за электраэнергію па тарыфах, якія дзферэнцыраваны па перыядах часу, што дае магчымасць знізіць выдаткі на аплату электрычнасці. Акрамя таго, праз «АСКУЭ-быт» можна атрымліваць інфармацыю аб колькасці ўжытай электраэнергіі за розныя перыяд (калі вы аплачваеце святло праз АІС «Разлік») без самастойнага зняцця паказчыкаў, сцвярджаюць энергетыкі. У перспектыве яны абяцаюць інтэграваць «АСКУЭ-быт» з АРІП, што яшчэ больш спросціць схему плацяжоў.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

### Цікава ведаць

Наша краіна стала першай замежнай пляцоўкай, дзе Дзяржкарпарацыя «Расатам» пабудавала АЭС з вода-вадзяным рэактарам пакалення «3+» — з павышанымі характарыстыкамі бяспекі. Рэактар станцыі пакрыты двайной ахоўнай абалонкай з металу і бетону. Унутраная выключае выхад радыеактыўных рэчываў у наваколле, а вонкавая — сумесна з унутранай служыць фізічнай абаронай ад прыродных і тэхнагенных уздзеянняў, у тым ліку ад землятрусаў і буранаў.

У якасці паліва на АЭС выкарыстоўваецца слабаабагачаны дыяксід урану ў выглядзе таблетак памерам 9-12 мм, якія змяшчаюцца ў герметычных трубках (цеплавыдзяляльных элементах). Адна пяціграмовая ўранавая таблетка замяшчае 400 кілаграмаў вугалю, 350 кілаграмаў нафты, 360 м³ газу. Станцыя разлічана на 60 гадоў работы, а з улікам практыкі працягнення тэрмінаў службы — на стагоддзе.

Гэты праект стаў для Беларусі асновай развіцця атамнай энергетыкі, гарантам энергетычнай бяспекі ў найбліжэйшыя дзесяцігоддзі і вялікім крокам у развіцці нацыянальнай эканомікі, адзначаюць айчынныя энергетыкі. Яны не выключаюць, што ў Беларусі будзе будавацца другая АЭС. Навуковыя даследаванні і эканамічныя разлікі, зыходзячы з комплекснай праграмы развіцця краіны, вядуцца пад кіраўніцтвам НАН з удзелам расійскіх спецыялістаў. Мяркуецца, што да восені 2022-га кіраўніку дзяржавы будуць унесены адпаведныя прапановы.

### ДАСЛОЎНА



**Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Ірына КРАЛЕВІЧ:**

— Дзякуючы прадуманай і ўпэўненай палітыцы кіраўніка дзяржавы, мы не толькі пераадольваем наступствы аварыі, што здарылася ў 1986 годзе на ЧАЭС, але і актыўна развіваем атамную энергетыку ў мірных мэтах. Гэтага і датычыцца норма ў абноўленай Канстытуцыі: Рэспубліка Беларусь развівае атамную энергетыку ў мірных мэтах, гарантуе бяспеку пры вытворчасці і выкарыстанні атамнай энергіі. Сёння жыццё яшчэ раз даказала правільнасць прынятага рашэння аб будаўніцтве ў нашай краіне атамнай станцыі. Ва ўмовах санкцыйнага ціску на краіну атамная станцыя — адзін з гарантаў нашай энергетычнай і эканамічнай бяспекі. За атамнай энергетыкай будучыня, гэта разумее ўвесь свет. І тое, што мы прапісалі развіццё атамнай энергетыкі ў Асноўным Законе краіны, гаворыць аб многім. У першую чаргу аб тым, што нашы прадпрыемствы змогуць і ў далейшым вырабляць канкурэнтаздольную прадукцыю, запатрабаваную на знешніх рынках. А гэта — папаўненне бюджэту і эканамічная падтрымка кожнай сям'і, кожнага чалавека. Павінна адзначыць, што бяспецы атамнай энергетыкі ў нашай краіне ўдзяляецца вялікая ўвага на ўсіх узроўнях. Дастаткова сказаць, што ўжо распрацоўваецца і паступіць вясной на разгляд у Палату прадстаўнікоў новы законапраект «Аб рэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі», які ўключаны указам кіраўніка дзяржавы ў план разгляду законапраектаў на 2022 год.

**ПОЎНЫ ТЭКСТ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ СА ЗМЯНЕННЯМІ І ДАПАЎНЕННЯМІ, ЯКІЯ ВЫНОСЯЦЦА НА РЭФЕРЭНДУМ, — У НУМАРЫ «ЗВЯЗДЫ» ЗА 22 СТУДЗЕНЯ І НА САЙЦЕ ZVIAZDA.BY**

# І яшчэ пра падатковыя нюансы



## ДЭКЛАРАЦЫЮ ЗА НАС ПАДАСЦЬ НАЙМАЛЬНІК

Як адзначыў **начальнік Галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Андрэй КАВАЛЕЎСКІ**, з пачатку года ўвайшлі ў сілу змяненні ў Падатковы кодэкс. Яны закранулі ўсе катэгорыі плацельшчыкаў: фізічных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў і юрыдычных асоб.

Як вядома, усе людзі з'яўляюцца плацельшчыкамі чатырох асноўных відаў падаткаў: гэта падаходны падатак з фізічных асоб, падатак на нерухомасць, зямельны і транспартны падаткі. Што датычыцца падаходнага падатку з фізічных асоб, то значных змен у бягучым годзе тут для грамадзян не адбылося. Але варта адзначыць, што павышаны сумы, якія не абкладаюцца падаходным падаткам, і праіндэксаваны стаўкі вылікаў, прыведзеныя ў лічбавым выражэнні. Гэтая работа ажыццяўляецца кожны год. У прынцыпе ўсе сумы, якія не абкладаюцца падаходным падаткам, павышаны ў межах 5–7 %.

Варта адзначыць вельмі важнае новаўвядзенне, што закранае суб'ектаў гаспадарання, якія выплачваюць грамадзянам даходы. Для іх з гэтага года ўводзіцца абавязацельства прадстаўляць падатковую дэкларацыю па падаходным падатку. Гэта значыць штоквартальна любыя беларуская арганізацыя і індывідуальны прадпрымальнік, якія выплачваюць насельніцтву даходы, будуць прадстаўляць ужо асобную, новую дэкларацыю па падаходным падатку. Раней частка звестак накіроўвалася ў падатковы орган, гэта была інфармацыя аб сумах, якія падлягаюць пералічэнню падаходнага падатку; аб фондзе заработнай платы, але цяпер гэта ўсё ўжо вылучаецца ў асобную дэкларацыю.

## ІЛЬГОТА АДМЯНЯЕЦЦА, АЛЕ НЕ ДЛЯ ЎСІХ

Значныя змены адбыліся ў дачыненні да падатку на нерухомасць і зямельнага падатку. «Тут самае галоўнае змяненне — гэта адмена падатковай ільготы ў дачыненні да адной кватэры. Да 2022 года, калі фізічнай асобе па праве ўласнасці належала толькі адна кватэра, яна вызвалялася ад падаткаабкладання, а ўжо з другой і наступнай кватэры неабходна было выплачваць падатак на нерухомасць, прычым стаўка падатку складала 0,2 % і да яе выкарыстоўваліся яшчэ павышэнні, прадугледжаныя рашэннямі мясцовых Саветаў дэпутатаў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

З гэтага года кожная кватэра ва ўласнасці грамадзян будзе абкладацца падаткамі», — адзначыў начальнік галоўнага ўпраўлення.

Нерухомасцю валодаюць розныя катэгорыі грамадзян: як працаздольныя, так і пенсіянеры па ўзросце, інваліды першай і другой групы, члены шматдзетных сем'яў. Улічваючы гэта, было адназначна вызначана, што для пенсіянераў па ўзросце, інвалідаў першай і другой групы, а таксама членаў шматдзетнай сям'і і непаўнагалетніх ільгота па адной кватэры захоўваецца. Для шматдзетных сем'яў любая колькасць кватэр не будзе абкладацца падаткам. Калі ў пенсіянера ва ўласнасці адна кватэра, падатак па ёй не выплачваецца, калі пенсіянер мае адну кватэру і адзін жылы дом, падатак з іх таксама не бярэцца, а толькі з другой кватэры і з другога жылога дома».

Па кватэрах існуе адзін нюанс. **Намеснік начальніка інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах Беларусі па Мінску Вольга ТАРАСЕВІЧ** адзначыла, што раней такая ж ільгота існавала для жылых дамоў гэтай жа катэгорыі грамадзян, але была абавязковая прывязка да таго, каб з імі не пражывалі працаздольныя грамадзяне, якія фінансава маглі заплаціць гэты падатак. Сёння такой прывязкі няма, гэта значыць дастаткова таго, што пенсіянер з'яўляецца ўласнікам жылога памяшкання, якое падлягае падаткаабкладанню. Ільгота па адной кватэры будзе дадзена яму аўтаматычна. Калі ў яго дзве кватэры, то льготай будзе забяспечана найбольш дарагая па цане, а кватэра з меншай цаной будзе падлягаць падаткаабкладанню.

## ЗА ДРУГУЮ КВАТЭРУ ЗАПЛАЦІМ МЕНШ

Перагледжаны падыходы да вызначэння падатковай базы і сумы падатку на нерухомасць. Інакш кажучы, падатак на нерухомасць па кватэрах будзе вылічвацца зыходзячы са стаўкі 0,1 % ад кошту кватэры для мэт падаткаабкладання.

Дадзены кошт будзе вызначацца падатковымі органамі зыходзячы з плошчы кватэры і разлікавага кошту тыпавога квадратнага метра жылля, які прыведзены ў Падатковым кодэксе. Напрыклад, на кватэру ў Мінску плошчай 60 квадратных метраў гадавая сума падатку на нерухомасць складзе менш за 50 рублёў. «Пры гэтым прадугледжаны парадак выплаты, размеркаваны на два гады: у 2022 годзе грамадзяне ўнясуць аванс 50 % ад гадавой сумы падатку на нерухомасць, а ў 2023-м ужо зробяць даплату да поўнай сумы падатку. Плаціць падатак неабходна будзе, як і раней, на падставе паведамлення падатковага органа, якое ўсім грамадзянам будзе накіравана да 1 верасня. Аналагічныя падыходы і ў зямельным падатку», — удакладніў Андрэй Кавалеўскі.

## ПРАВЕРКА ДАХОДАЎ І ВЫДАТКАЎ

У новым кодэксе, у прыватнасці, з'явіўся артыкул 73.1 «Камеральная праверка адпаведнасці выдаткаў даходам фізічнай асобы». Цяпер пад камеральную праверку таксама трапляюць і замежныя грамадзяне, і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Беларусі. Правяраць падаткавікі маюць права выдаткі і даходы за поўны каляндарны месяц ці некалькі месяцаў бягучага года, а таксама за 10 поўных гадоў, якія папярэднічаюць году, калі праводзіцца супастаўленне сум выдаткаў і паступленняў.

Такую праверку падатковая можа прызначыць з многіх прычын, пачынаючы ад запыту з міліцыі, дзяржкантролю, КДБ, пракуратуры і Следчага камітэта і заканчваючы даручэннем прадстаўнікоў падатковай інспекцыі або інфармацыяй аб буйной куплі. На правядзенне праверкі не выдаецца прадпісанне, так што пра яе пачатак чалавек наогул не будзе ведаць. Пры выяўленні перавышэння сум расходаў над даходамі ў памеры 500 і больш базавых велічынь падатковая запытае тлумачэнні. Грамадзянін павінен расказаць аб фінансавых паступленнях і пацвердзіць іх дакументальна на працягу 30 каляндарных дзён. Дадзены тэрмін можа быць падоўжаны, калі чалавек у гэты час знаходзіцца на бальнічным, за межамі Беларусі ці ў камандзіроўцы.

Да выдаткаў падатковая будзе адносіць суму на «набыццё мінімальнага набору прадуктаў харчавання і нехарчовых тавараў і паслуг, неабходных для захавання здароўя і забеспячэння жыццядзейнасці, у памеры бюджэту пражыткова мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва». Калі ў сям'і ёсць дзеці да 18 гадоў, то да выдаткаў таксама будуць адносіцца грошы на прадукты, тавары і паслугі ў памеры 50 % БПМ на кожнае дзіця. Сёння БПМ складае 321,22 рубля. Таксама да расходаў адносяцца грошы, выдаткаваныя на будаўніцтва нерухомасці.

Падатковую не будзе цікавіць, вы купляеце прадукты ў дарагіх крамах ці ў самых танных, вам трэба больш прадуктаў для жыцця ці вы ясце як індыйскі ёг — раз на тры дні. У разлік выдаткаў будуць прыняты мінімальныя сумы, бо гэта закон. А перад законам, як вядома, усе роўныя. Калі выдаткаў будзе больш, чым даходаў, то тады налічваецца падаходны падатак па павышанай стаўцы ў памеры 20 %.

## ІНВЕСТЫЦЫІ ПАТРЭБНЫЯ ЯК ПАВЕТРА

**Начальнік Галоўнага ўпраўлення метадалогіі падаткаабкладання Міністэрства па падатках і зборах Наталля КАНДРАЦЕНКА** падкрэсліла: большасць змяненняў у Падатковым кодэксе, якія датычацца арганізацый, накіравана на рашэнне практычных задач. Гэта значыць практыка падаткаабкладання паказала, што ў заканадаўстве трэба нешта ўдакладніць або змяніць сам парадак падаткаабкладання, для таго каб вырашыць тыя ці іншыя практычныя пытанні. Але таксама ёсць новаўвядзенні, якія заклікаці ўзмацніць інвестыцыйную актыўнасць суб'ектаў гаспадарання і прыцягнуць дадатковыя даходы ў бюджэты.

Паводле яе інфармацыі, па падатку на прыбытак павялічаны інвестыцыйныя вылік, які маюць права прымяняць арганізацыі. Па будынках і збудаваннях інвестыцыйны вылік вырас да 15 %, па абсталяванні — да 40 %.

Акрамя таго, інвестыцыйны вылік можна будзе выкарыстоўваць і ў дачыненні да даабсталявання асноўных сродкаў, а таксама пускавых комплексаў. Змяняецца таксама парадак уліку пры падаткаабкладанні рэкламных выдаткаў. Усе рэкламныя выдаткі, якія нясуць арганізацыі, будуць падзеленыя на два складнікі. **Адзін з іх — гэта выдаткі на рэкламу, размешчаную ў сродках масавай інфармацыі, а таксама для ўдзелу ў выставах і канферэнцыях. Іх можна будзе адносіць на выдаткі без усялякіх абмежаванняў**, такім чынам, яны па фактычных расходах будуць адносіцца да выдаткаў, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні. Усе астатнія віды рэкламных выдаткаў будуць аднесены ў 2022 годзе да расходаў, якія нарміруюцца, а іх сукупны памер не зможа перавышаць 1 % выручкі ад рэалізацыі тавараў, работ і паслуг.

Яшчэ адна важная навіна: з 2022 года мясцовыя Саветы дэпутатаў атрымалі права павялічваць асноўную стаўку падатку на прыбытак (яна складае 18 %) на два працэнтныя пункты для асобных катэгорый плацельшчыкаў падатку на прыбытак, якія выплачваюць яго ў мясцовыя бюджэты.

## ЗЯМЕЛЬНЫ І ТРАНСПАРТНЫ ПАДАТКІ

Робіцца сучасная падатковая база па зямельным падатку. Па словах Наталлі Кандрацэнкі, па кожнай ацэначнай зоне зямельных участкаў устаноўлены правілы, як вызначаецца кадастравая цана, падатковая база па зямельным падатку на 2022 год. Гэтая новая цана будзе размешчана на афіцыйным сайце Нацыянальнага кадастравага агенцтва.

А вось з першых дзён 2023-га ўводзіцца павышанае падаткаабкладанне некаторых зямельных участкаў. Гаворка пра тыя, якія выдзелены пад будаўніцтва капітальных будынкаў, будынкаў і збудаванняў, па якіх на працягу трох гадоў пасля вылучэння не праведзена дзяржаўная рэгістрацыя пабудаванага капітальнага будынка. Ці на працягу трох гадоў не ўведзены ў эксплуатацыю адпаведны аб'ект, калі дзяржаўная рэгістрацыя стварэння такога капітальнага будынка не патрабуецца. «Заўважу, дадзеная норма ўводзіцца з 1 студзеня 2023 года, але ў Падатковы кодэкс яна ўжо ўключана, каб арганізацыі маглі падрыхтавацца да гэтага павышанага падаткаабкладання і за 2022 год, напрыклад, увесці ў эксплуатацыю аб'екты, якія яшчэ не дабудаваныя», — падкрэсліла начальнік Галоўнага ўпраўлення.

Па транспартным падатку для арганізацый уводзіцца новая падатковая льгота, якая датычыцца транспартных сродкаў, законсерваваных ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку. «Гэта значыць арганізацыя, якая законсервуе свой транспартны сродак у гэтым парадку, зможа не выплачваць транспартны падатак з месяца, наступнага за месяцам пачатку кансервацыі транспартнага сродку», — растлумачыла спецыяліст.

Эксперт дадала: у падатак на дабаўленую вартасць, падатак на прыбытак, адзіны падатак для вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі ўведзеныя нормы таго, як вызначаецца падатковая база па гэтых падатках. Напрыклад, калі арганізацыя змяніла існуючую сістэму падаткаабкладання і тавары былі адгружаныя пры адной сістэме, а аплата за адгружаныя тавары прыйшла, калі арганізацыя ўжо ўжывала іншую сістэму.

---

Жыллё

# АТРЫМЛІВАЕЦЦА КРЫХУ БОЛЬШ ЗА АДНУ КВАТЭРУ НА ШМАТДЗЕТНУЮ СЯМ'Ю

**Да такіх высноў прыходзіш пасля праглядання статыстыкі жыллёвага будаўніцтва ў сталіцы. А работы ў будаўнікоў на гэтай ніве непачаты край. Бо чарга тых, хто мае патрэбу ў жыллі ў Мінску на гэты момант, налічвае больш за 187 тысяч сем'яў.**

Дарэчы, летась выдзяленне жылля чаргавікам вялося апераджальнымі тэмпамі. А дзевядзеня Мінгарвыканкаму заданні па забеспячэнні шматдзетных сем'яў жыллём нават перавыкананы. «Пры заданні 1,6 тысячы сем'яў мы далі магчымасць паляпшэння жыллёвых умоў 1647 сем'ям. Для гэтага было выкарыстана 1757 кватэр у аб'ектах долевага будаўніцтва ў Мінску і горадзе-спадарожніку Смалявічах, а таксама чаргавікам прададзена 40 гатовых кватэр і выдзелена тры кватэры дзяржаўнага жыллёвага фонду», — адзначыла **начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама Алена ЛУКАШЭВІЧ**.

А вось чарга агульнай групы тых, хто мае патрэбу, рухалася не так хутка. Але ім таксама прапаноўваліся розныя варыянты паляпшэння жыллёвых умоў. Больш за 500 чалавек — работнікаў прадпрыемстваў і арганізацый — выбіралі паміж будаўніцтвам, атрыманнем арэнднай або сацыяльнай кватэры.

Чыноўнікі ад будаўніцтва запланавалі на гэты год працягнуць як будаўніцтва жылля для тых, хто мае патрэбу, у тым ліку ў горадзе-спадарожніку Смалявічах, так і ўзвядзенне арэнднага жылля. У прыватнасці ўвядуць новы дом на перакрыжаванні вуліц Шаранговіча—Гарэцкага. Уключаць у абарот і вызваленыя кватэры, якія будуць даваць у якасці арэнднага жылля розным катэгорыям грамадзян. У Фрунзенскім раёне плануецца будаўніцтва сацыяльнага жылля. Іншы даступны для работнікаў прадпрыемстваў спосаб, па словах Алены Лукашэвіч, — заключэнне дагавароў долевага будаўніцтва з дзяржаўным забудоўшчыкам з абмежаваным прыбыткам.

**Матэрыялы падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

На слыху

# КАБ МІНІМІЗАВАЦЬ ЧЭРГІ І НЕБЯСПЕКУ ЗАРАЖЭННЯ

## Абавязковае тэсціраванне на COVID-19 адменена, хварэць можна без бальнічнага тры дні



**МІНІСТЭРСТВА аховы здароўя Рэспублікі Беларусь дазволіла ўрачам устанаўліваць дыягназ «інфекцыя COVID-19» пры наяўнасці клінічных і/або рэнтген-тамаграфічных даных — без правядзення абавязковага ПЛР-тэсціравання або антыген-тэсціравання на амбулаторным этапе. Выключэнне — тыя выпадкі, калі патрабуецца шпіталізацыя пацыента ў стацыянар. Загад № 108 падпісаны ў Міністэрстве аховы здароўя 31 студзеня 2022 года.**

Як паведамляе прэс-служба ведамства, згодна з дазорнымі даследаваннямі беларускіх эпідэміёлагаў, сёння пераважае вірус SARS-CoV-2, хоць паралельна цыркулююць вірусы грыпу і негрыпозныя сезонныя вірусы. Спецыялісты адзначаюць, што вынік лабараторнага тэста на COVID-19 ніяк не адбіваецца на лячэнні. Этыятропнага лячэння ад каранавіруснай інфекцыі няма, яно такое ж, як і пры іншай рэспіраторнай інфекцыі. Калі захворванне праходзіць у лёгкай форме, пацыент знаходзіцца на лячэнні ў хатніх умовах. Ён выконвае ўсе рэкамендацыі ўрача, у тым ліку п'е шмат вадкасці, ужывае парацэтамол пры павышэнні тэмпературы і праводзіць звычайнае сімптаматычнае лячэнне. Калі медработнікі ўстанаўліваюць дыягназ «пнеўманія», то, адпаведна, яе і будуць лячыць.

Гэта норма прынята з мэтай зніжэння рызыкі заражэння вострымі рэспіраторнымі інфекцыямі, у тым ліку інфекцыяй COVID-19, пры наведванні амбулаторна-паліклінічных арганізацый.

### СТУДЭНТЫ-МЕДЫКІ 6 КУРСА МОГУЦЬ АФАРМЛЯЦЬ БАЛЬНІЧНЫЯ

Студэнты 6 курсаў медуніверсітэтаў, прыцягнутыя да аказання меддапамогі, цяпер змогуць самі афармляць пацыентам бальнічныя.

Міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч падпісаў адпаведны загад 1 лютага бягучага года. Ён дазваляе студэнтам 6 курса медыцынскіх універсітэтаў, прыцягнутым да аказання медыцынскай дапамогі ў амбулаторна-паліклінічных умовах, праводзіць экспертызу часовай непрацаздольнасці, выдаваць і афармляць лісткі непрацаздольнасці.

Начальнікі галоўных упраўленняў па ахове здароўя абласных выканаўчых камітэтаў, старшыні Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама мусяць правесці ўводны інструктаж з наступнай праверкай ведаў па пытаннях правядзення экспертызы часовай непрацаздольнасці афармлення і выдачы лісткоў непрацаздольнасці і дакладаць аб часовай непрацаздольнасці.

### ТРЫ ДНІ БЕЗ БАЛЬНІЧНАГА

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны нагадала, што ў краіне дзейнічае норма аб праве наймальніка вызваляць ад работы работніка ў сувязі з яго хваравітым станам на тэрмін да трох каляндарных дзён сумарна. Яна замацавана ў пункце 14 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 24 красавіка 2020 г. № 143 «Аб падтрымцы эканомікі». Пры гэтым работнік можа не прадстаўляць лісток непрацаздольнасці або не афармляць іншыя дакументы, якія пацвярджаюць хваравіты стан.

— Калі работнік адчуў недамаганне, ён можа звярнуцца да наймальніка або іншай службовай асобы, вызначанай у арганізацыі наймальнікам, з просьбай аб вызваленні ад работы ў сувязі з дрэнным самаадчуваннем, — растлумачылі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

Тэрмін вызвалення ад работы вызначаецца работнікам па ўзгадненні з наймальнікам і можа складаць адзін, два ці тры дні. Вызваленне ад работы без прадстаўлення пацвярджальнага дакумента не можа перавышаць тры дні сумарна.

Пры гэтым важна ведаць, што адсутнасць на рабоце па дадзеных абставінах можа адбывацца толькі па ўзгадненні з наймальнікам, у адваротным выпадку можа расцэньвацца як прагул. Парадак узаемадзеяння работніка і наймальніка па рэалізацыі гэтай нормы ўказа можа быць замацаваны ў лакальным прававым акце арганізацыі.

Захаванне сярэдняга заробку за перыяд вызвалення ад работы можа быць прадугледжана калектыўным дагаворам, іншым лакальным прававым актам арганізацыі, за выключэннем бюджэтных арганізацый і іншых арганізацый, якія атрымліваюць субсідыі, работнікі якіх прыраўнаваныя па аплаце працы да работнікаў бюджэтных арганізацый.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ЯК НЕ СТАЦЬ АХВЯРАЙ ВОГНЕННАЙ СТЫХІІ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Праводзячы разведку, я і старшы пажарны, малодшы сяржант унутранай службы Вадзім Мірон, на ўваходзе ў кватэру, дзе быў пажар, знайшлі жанчыну і вынеслі яе на вуліцу, — расказаў **начальнік варты пажарнай аварыйна-ратавальнай часці № 1 Дзяржынскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, лейтэнант унутранай службы Максім МАГЕР.** — Выратаваную перадалі медыкам. Адно звяно газадымаабаронцаў працавала на ратаванне і ліквідацыю ўзгарання ў кватэры, другое — на ратаванне і эвакуацыю людзей з паверхаў, якія размяшчаюцца вышэй. На лесвічнай клетцы паміж чацвёртым і пятым паверхамі мы выявілі траіх маладых людзей. Мужчыну з другога паверха вывелі пры дапамозе спецыяльнай маскі. Паралельна адчынялі вокны, каб выпусціць дым з пад'езда.

У выніку на пажары былі выратаваны пяць чалавек. Медыцынская дапамога спатрэбілася толькі жанчыне, у кватэры якой узнікла ўзгаранне (у выніку сэрца жанчыны перастала біцца ў бальніцы). Гаспадар жылой плошчы загінуў на месцы здарэння. Ахвярамі агню сталі і жыхары Калінкавіцкага раёна. 26 студзеня на пажары загінулі бацька і дачка. Па словах суседзяў, яны злоўжывалі спіртнымі напоямі, курылі — часта ў нецвярозым стане. Неасцярожнае абыходжанне з агнём падчас курэння і стала прычынай пажару.

Па адной з версій, менавіта з-за непатушанай цыгарэты ў апошні дзень студзеня загінулі і два мужчыны: адзін, грамадзянін 1984 года нараджэння, з аграгарадка Салтанава Рэчыцкага раёна, другі, 1978 года нараджэння, з вёскі Калонія Кобрынскага раёна.

### НАЙЛЕПШЫ СЯБАР — АПАВЯШЧАЛЬНІК

З пачатку года толькі ў Барысаўскім раёне ратавальнікі выязджалі на тушэнне 11 пажараў, на якіх загінулі тры чалавекі. 25 студзеня ў цэнтр аператыўнага кіравання Барысаўскага гарадскога раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях паступіла паведамленне аб загаранні жылога дома ў вёсцы Дзедзілавічы. Пакуль ратавальнікі прыбылі на месца здарэння (а ў такіх сітуацыях у іх распараджэнні ўсяго некалькі хвілін), дом гарэў адкрытым полымем. На падлозе ў жылым памяшканні супрацоўнікі МНС знайшлі гаспадыню. На жаль, яна была ўжо без прыкмет жыцця. Адной з прычын узнікнення пажару, якія разглядаюцца, — неасцярожнае абыходжанне з агнём падчас курэння.

— І гэта не адзіны выпадак, калі чалавек, забываючы аб элементарных правілах пажарнай бяспекі, плаціць самую высокую цану — страчвае жыццё, — заўважае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Нельга дапускаць курэння ў жылых памяшканнях. Месцы для гэтай згубнай звычкі трэба абсталяваць попельніцай з негаручага матэрыялу. Не варта забываць і аб тым, што курэнне каля лёгкагаручых і гаручых вадкасцяў таксама можа прывесці да трагедыі, а своечасова патушаны недакурак або запалка пасля іх выкарыстання з'яўляецца абавязковай умовай бяспечнага быту. І самы просты спосаб зберагчы сябе і сваіх блізкіх ад пажару і яго наступстваў — устанавіць аўтаномны пажарны апавяшчальнік у жылых пакоях.

Менавіта гэты прыбор, які гучна сігналізаваў аб тым, што дзесьці здарылася трагедыя, нядаўна прымусіў жыхароў шматкватэрнага дома аграгарадка Стары Свержань Стаўбцоўскага раёна звярнуць увагу на суседнюю кватэру, з якой ішоў густы дым. Выклікаўшы ратавальнікаў, людзі аператыўна пакінулі свае кватэры. Супрацоўнікі МНС, якія прыбылі на месца здарэння, зафіксавалі ўзгаранне ў адной з кватэр двухпавярховага дома. Па папярэдняй інфармацыі, там знаходзіўся чалавек. Падчас разведкі ратавальнікі выявілі дваіх мужчын, дапамога якім, на жаль, ужо была непатрэбная...

У той дзень у Стаўбцоўскім раёне была яшчэ адна ахвяра агню. Толькі за суткі ў адным раёне краіны на пажарах загінулі тры чалавекі! Усяго ў студзені на тэрыторыі Мінскай вобласці адбылося 116 пажараў, якія абарвалі жыцці 21 чалавека. У краіне спачатку года адбылося 508 пажараў, на якіх загінулі 98 чалавек.

Ратавальнікі не перастаюць паўтараць: у аснове кожнай з прычын, з якіх узніклі падобныя надзвычайныя сітуацыі, — бездаказнасць, няўбайнасць і няўважлівасць канкрэтнага чалавека. Супрацоўнікі МНС звяртаюць увагу грамадзян на неабходнасць прывядзення домаўладання ў пажарабяспечны стан і заклікаюць выконваць элементарныя правілы: замяніць старую праводку, не перагружаць электрычную сетку, эксплуатаваць выключна спраўныя печы, не курыць у жылым памяшканні.

### ГІСТОРЫІ СА ШЧАСЛІВЫМ ФІНАЛАМ

Як прызнаюцца супрацоўнікі МНС, колькасць выратаваных жыццяў яны ніколі не лічаць. Хоць памятаюць амаль кожную гісторыю са шчаслівым канцом. І з нешчаслівым, на жаль, таксама. Людзей, якія падарылі ім другое жыццё, ніколі не забудуць і тыя, хто мог стаць ахвярай агню.

Сярод іх — і пажылая жанчына з пасёлка Альба, што ў Нясвіжскім раёне. Паведамленне аб задымленні ў адной з кватэр жылога дома ратавальнікам паступіла ў ноч на 8 студзеня. Падраздзяленні МНС, якія прыбылі па ўказаным адрасе, выявілі шчыльнае задымленне ў кватэры на трэцім паверсе. Ратавальнікі знайшлі ў калідоры гаспадыню маёмасці. Высветлілася, што, адчуўшы пах дыму, пенсіянерка выявіла ўзгаранне мэблі, якое адбылося ад непатушанай свечкі. Гаспадыня спрабавала справіцца з дымам самастойна, аднак у яе нічога не атрымалася. Тады жанчына накіравалася да выхаду, аднак паслізнулася і ўпала. Выйсці з кватэры сама яна ўжо не магла. Добра, што ратавальнікі прыбылі на дапамогу своечасова.

У патрэбным месцы ў патрэбны час апынуўся і жыхар Магілёва. Алег Новікаў, які знаходзіўся ў гасцях, убачыў, што з суседняга дома ідзе дым. Не раздумваючы, мужчына праз незачыненыя дзверы прабраўся ў жыллё, убачыў гаспадара на падлозе і выцягнуў яго на свежае паветра. Жыццю пацярпелага нічога не пагражала: ён быў дастаўлены ў бальніцу. А вось ад хаты мала што засталося: ратавальнікі прыбылі, калі яна гарэла адкрытым полымем.

Хэпі-эндам скончылася і надзвычайнае здарэнне ў Лідзе. Супрацоўнікі МНС ліквідавалі пажар у двухкватэрным доме. Як стала вядома, узгаранне ўзнікла ад непатушанай свечкі. Гаспадыня адчула пах дыму, калі знаходзілася на верандзе, дзе займалася гаспадарчымі справамі. У хаце спала яе двухмесячнае дзіця. Хлопчык атрымаў апёкі. Яшчэ дваіх дзяцей, а таксама дарослых супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях выратавалі ад смерці ў Гарадку, што на Віцебшчыне. На паведамленне аб пажары ў шматкватэрным доме ратавальнікі прыбылі за лічаныя хвіліны.

— З акна кватэры ішоў дым, было відаць полымя, — успамінае гэты выпадак **начальнік дзяжурнай змены пажарнай аварыйна-ратавальнай часці № 1 Гарадоцкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Дзмітрый МУКАМОЛ.** — Разам з калегамі мы ўключыліся ў апараты і пабеглі ўнутр. У пад'ездзе было ўсё задымлена. У кватэры, якая гарэла, у дальнім памяшканні мы ўбачылі мужчыну. Ён стаяў каля сцяны, быў разгублены і дэзарыентаваны. Мы вывелі яго на вуліцу і перадалі медыкам. Мужчына быў моцна п'яны, ад шпіталізацыі адмовіўся. У гэты час па радыёстанцыі дыспетчар перадала інфармацыю, што на другім паверсе ў кватэры яшчэ ёсць людзі, якія з-за моцнага дыму не могуць пакінуць дом. Мы пабеглі на другі паверх. Там знаходзіліся жанчына і двое яе дзяцей. Яны былі спалоханыя і баяліся ісці ў задымлены пад'езд. Супакоіўшы, адзелі на іх маскі і вывелі на свежае паветра.

Паралельна ратавальнікі эвакуіравалі яшчэ траіх жыхароў дома. На шчасце, абышлося без пацярпелых і ахвяр. З-за непатушанай цыгарэты гаспадара адной з кватэр як мінімум яшчэ шэсць чалавек маглі пазбавіцца жыцця.

### ПАПЯРЭДЗІЦЬ — ЗНАЧЫЦЬ «УЗБРОІЦЬ»

Каб яшчэ раз прыцягнуць увагу насельніцтва да праблемы гібелі на пажарах, у канцы студзеня стартавала рэспубліканская акцыя «Бяспека — у кожны дом». На першым этапе ў цэнтры ўвагі ратавальнікаў былі людзі, якія злоўжываюць спіртным і вядуць асацыяльны спосаб жыцця. Супрацоўнікі МНС, органаў унутраных спраў, прадстаўнікі «Чырвонага Крыжа», маладзёжнай і піянерскай арганізацый, духавенства, а таксама добраахвотнікі з прафілактычнымі гутаркамі наведалі аддзяленні дзённага знаходжання наркадыспансераў, апорныя пункты міліцыі, а таксама цэнтры бяспекі.

На другім этапе акцыі ўвага арганізатараў засяродзілася на пажылых грамадзянах з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, жыхарах сельскіх населеных пунктаў, а таксама студэнтах ВНУ, ліцэяў і каледжаў. На завяршальным этапе прапагандысты Міністэрства па надзвычайных сітуацыях традыцыйна разгорнуць інтэрактыўныя пляцоўкі ў месцах масавага знаходжання людзей, дзе яшчэ раз нагадаюць, што больш чым палова надзвычайных здарэнняў адбываецца па віне людзей, якія не ведалі аб правілах пажарнай бяспекі або бездакразна аднесліся да іх выканання.

**Вераніка КАНЮТА.**

## КАМЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
## сообщает о проведении 4 марта 2022 года открытого аукциона по продаже земельных участков на территории Каменского сельсовета Логойского района

| Номер лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена, бел. руб. | Расходы по подготовке зем. документации | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Аукцион по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | | | | | | |
| 1 | **Минская область, Логойский район, д. Чмелевичи, 12А,** земельный участок с кадастровым номером 623282713601000036, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1837 | Возможность подключения к электроснабжению, водоснабжению, имеется подъездная грунтовая дорога | 3000,00 | *Публикация в газете + 1 752,00 руб.* | 600,00 |
| 2 | **Минская область, Логойский район, д. Фильяново, 23А,** земельный участок с кадастровым номером 623282712601000039, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,2499 | Возможность подключения к электроснабжению, имеется подъездная грунтовая дорога | 3000,00 | *Публикация в газете + 1 612,89 руб.* | 600,00 |
| 3 | **Минская область, Логойский район, д. Фильяново, 28А,** земельный участок с кадастровым номером 623282712601000035, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,2009 | Возможность подключения к электроснабжению, имеется подъездная грунтовая дорога | 2500,00 | *Публикация в газете + 1 621,72 руб.* | 500,00 |
| 4 | **Минская область, Логойский район, аг. Камено, У-1,** земельный участок с кадастровым номером 623282704101000176, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,2500 | Возможность подключения к электроснабжению, водоснабжению, имеется подъездная асфальтированная дорога | 4500,00 | *Публикация в газете + 211,28 руб.* | 900,00 |

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

***Задаток (20 % от начальной цены) перечисляется на расчетный счет № BY42AKBB36006190711030000000 в ОАО АСБ «Беларусбанк», БИК банка AKBBBY2X в г. Логойск, УНН 600537220, код платежа 04901, получатель – Каменский сельский исполнительный комитет, УНН 600181630.***

Для участия в аукционе необходимо:

1. Подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведению аукционов.
2. Представить квитанцию об оплате суммы задатка.
3. Предъявить документ удостоверяющий личность, либо доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.
4. Заключить соглашение с местным исполнительным комитетом или по его поручению с государственной организацией по проведению аукционов.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

**Аукцион состоится 4 марта 2022 года в 10.00 по адресу: аг. Камено, ул. Центральная, д. 7А, актовый зал.**

**Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 с 14.00 до 17.00 по адресу: аг. Камено, ул. Центральная, д. 7А.**

**Последний день приема заявлений – 28 февраля 2022 года до 17.00.**

Контактные телефоны: **(801774) 72381, 72335, +375291700261.**

Наш сайт в интернете: **logoysk.gov.by.**

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Предмет торгов – Лот:** капитальное строение с инвентарным номером 161/С-19783 (наименование: здание склада; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 123,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Каменецкий р-н, Ратайчицкий с/с, д. Тростяница, ул. Брестская, 10А, на земельном участке с кадастровым номером 124085500001000034 площадью 0,0330 га

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 5 000,00 | Размер задатка, руб. | 500,00 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Беловежский», Брестская обл., Каменецкий р-н, аг. Беловежский, ул. Ленина, 2, тел./факс 80631 72777. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB 30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 20 рабочих дней с даты подписания протокола аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатору аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 17 февраля 2022 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 16 февраля 2022 г. до 17.00**

## ИНФОРМАЦИЯ
## о проведении повторного аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего
## ОАО «Химчистка и стирка белья»

**Организатор аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации»,** 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, тел.: 8-0222-42-25-64, 8-029-15-15-444.

**Повторный аукцион состоится 18 февраля 2022 года в 12.00 в конференц-зале ОАО «Универмаг «Центральный» по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 61.**

**Предмет аукциона** (наименование объекта, его местонахождение, арендуемая площадь, кв. м):

**ЛОТ № 1**

- изолированное помещение с инв. № 700/D-152301 общей площадью 363,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, Славгородское шоссе, 179-2;
- изолированное помещение с инв. № 700/D-152300 общей площадью 156,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, Славгородское шоссе, 179-1;
- капитальное строение (склад) с инв. № 700/С-81484, общей площадью 78,0 кв. м; капитальное строение (склад) с инв. № 700/С-81483 общей площадью 128,0 кв. м; капитальное строение (благоустройство территории) с инв. № 700/С-106077 общей площадью 3315,4 кв. м; ворота металлические; ограждение металлическое; эстакада железобетонная, расположенные по адресу: г. Могилев, Славгородское шоссе, 159.

Начальная цена продажи – 89 100 р. 00 к. (с учетом НДС).
**Начальная цена продажи снижена на 19 %.**
Заявки принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407.
**Последний день приема заявлений и внесения задатка – 17 февраля 2022 года до 13.00.**
Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.
**Информация об опубликовании извещения размещена на официальных сайтах** Могилевского областного исполнительного комитета **www.mogilev-region.gov.by**, Могилевского городского исполнительного комитета **www.mogilev.gov.by.**

УНП 700008710

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
**(Организатор аукциона)**
**извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ИНТЕГРАЛ»-управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ» (Продавец)**

**Лот № 1:**
### ЗДАНИЕ ГАМБУРГЕРНОЙ (литер У 1/м-к)
**с инв. № 500/С-31002, 757 кв. м.**
**Адрес: г. Минск, ул. Корженевского, 16/9.**
**Обременения: аренда.**

**Начальная цена с НДС** – 865 190,04 руб.
**Задаток** – 85 000,00 руб. **Штраф** – 50 000,00 руб.

Земельный участок с кадастровым номером 500000000004006953 площадью 0,2543 га. Право аренды. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Аукцион состоится **14.02.2022 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. **Шаг аукциона** – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 ОАО «Белагропромбанк», г. Минск ул. Романовская Слобода, 8, BIC банка BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами – **10.02.2022 в 11.00**.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## УЗДЕНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 4 марта 2022 года в 10.00
### по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, проводит открытый аукцион за право частной собственности на земельные участки и на права заключения договоров аренды земельного участка

Организатор аукциона – Узденский районный исполнительный комитет

На аукционные торги по продаже земельных участков в частную собственность гражданам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов выставляются участки:

| № лота | Местонахождение участка | Площадь S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Сумма возмещения затрат на оформление и регистрацию участка (кроме расх. на публ-цию извещ.) | Ограничения (обременения) в использовании |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская обл., г. Узда, ул. Василия Ерёменко, уч. № 22 | 0,1199 | 625650100003001740 | 24 000,00 | 2400,00 | 1442,64 | Земельный участок расположен на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне пруда № 87) на площади 0,1199 га |
| 2 | Минская обл., г. Узда, ул. Василия Ерёменко, уч. № 24 | 0,1200 | 625650100003001742 | 24 000,00 | 2400,00 | 1442,64 | Земельный участок расположен на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне пруда № 87) на площади 0,1200 га |

На аукционные торги по продаже земельных участков в частную собственность гражданам для коллективного садоводства выставляются земельные участки:

| № лота | Местонахождение участка | Площадь S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Сумма возмещения затрат на оформление и регистрацию участка (кроме расх. на публ-цию извещ.) | Ограничения (обременения) в использовании |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3 | Минская обл., Узденский р-н, Узденский с/с, СТ «Литвянка», уч. 74 | 0,1200 | 625684200008000055 | 1660,00 | 166,00 | 1618,41 | Земельный участок расположен на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения на площади 0,1120 га, расположен на мелиорируемых (мелиорированных землях на площади 0,1200 га |
| 4 | Минская обл., Узденский р-н, Узденский с/с, СТ «Литвянка», уч. 130 | 0,1200 | 625684200008000056 | 1660,00 | 166,00 | 1618,41 | Земельный участок расположен на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения на площади 0,1200 га, расположен на мелиорируемых (мелиорированных землях на площади 0,1200 га |
| 5 | Минская обл., Узденский р-н, Узденский с/с, СТ «Литвянка», уч. 131 | 0,0899 | 625684200008000051 | 1250,00 | 125,00 | 1069,14 | - |
| 6 | Минская обл., Узденский р-н, Узденский с/с, СТ «Новая Усса», уч. 248 | 0,0966 | 625684200005000015 | 1730,00 | 173,00 | 1224,75 | - |

На аукционные торги на право заключения договора аренды выставляется земельный участок для строительства и обслуживания складских объектов:

| № лота | Местонахождение участка | Площадь S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Сумма возмещения затрат на оформление и регистрацию участка (кроме расх. на публ-цию извещ.) | Ограничения (обременения) в использовании |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4 | Минская обл., Узденский район, Узденский с/с, пос. Смолзавод, ул. Центральная | 0,2420 | 625684210601000033 | 1999,53 | 199,95 | | |

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (либо через своего представителя или уполномоченное лицо) предъявляет:

- заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка.

Кроме того, в комиссию представляются:

- гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);
- представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ, с указанием банковских реквизитов юридического лица (для уточнения правильности оформления необходимого пакета документов обращаться по телефону 8 (01718) 63960).

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

После получения необходимых документов от гражданина, индивидуального предпринимателя и юридического лица на участие в аукционе комиссия или организация выдает ему билет участника аукциона, который перед началом аукциона необходимо обменять на аукционный номер.

**Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 405, по рабочим дням с 2 февраля по 28 февраля 2022 г. включительно с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30.**

Аукцион состоится по лоту при наличии двух или более участников аукциона.

*Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY18AKBB36006310025120000000 Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области, г. Минск, ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600537220, код банка AKBBBY2X, код платежа – 4901 (плата за право частной собственности на земельные участки), платежным поручением (квитанцией) с пометкой «Задаток за земельный участок».*

Заключительная регистрация – с 9.00 до 9.50 в день проведения аукциона.

Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) производится в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков, предварительно позвонив по телефонам: 8 (01718) 65404, 63960.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: **www.uzda.gov.by** либо по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, каб. 405 и по телефону (801718) 63960.

Чалавек — чалавеку

# «ХОБІ Ў МЯНЕ ТАКОЕ — РАБІЦЬ ДАБРО»

**...Калі б мела паэтычны талент, абавязкова напісала б прыгожыя радкі, у якіх параіла б людзям не класці свае сілы, здароўе, час на здабыванне золата, грошай, дарагіх кватэр і машын, не штурхацца ў чарзе за пасадамі ды ўзнагародамі, бо галоўнае, што чалавеку трэба ў жыцці, не прадаецца і не купляецца. Яно здабываецца — працай душы, яно, магчыма, як той бумеранг, часам вяртаецца.**



Увесь мой жыццёвы шлях — ціха і прыгожа, як лампадка перад іконай — асвятляе адзін успамін. Мне гадоў, можа, з дзесяць. Я «снедаю», гэта значыць вакол хаты збіраю зайцаву капусту і ем. Яна кіславатая і зусім нясмачная, але яе тут шмат, значыць, можна суняць голад.

У тую мінуту я ўжо, мусіць, прагнала яго, бо ўбачыўшы на лавачцы нашу суседку — бабулю Антоніху (невялічкую, вельмі акуратную, добрую) падбегла да яе, села побач.

— Гэта ўсё, што ты сёння ела? — спытала ў мяне бабуля, глядзячы на заціснутую ў мой кулачок кісліцiну.

— Так, — заківала я галавой ды яшчэ дадала, што нічога іншага ў нашым доме нямашака.

— А мая ж ты зорачка! — выдыхнула бабуля, абняўшы мяне за плечы. — Быў бы жывы твой татка!.. Пайшлі да мяне. Я цябе пакармлю, дам крышачку сала.

Ад гэтых слоў мне захацелася плакаць і абняць паўсвету... Ці хоць бы адну бабулю: сваімі худымі ручанятамі я абвіла яе шыю і пацалавала ў твар.

...Астатак таго самага дня стаў для мяне ці не самым шчаслівым. Вясёлая, бадзёрая, я бегала па вуліцы, нешта рабіла, а галоўнае — увесь час думала, што калі вырасту, буду як бабуля Антоніха, рабіць дабро.

Праўда, вырасці мне было вельмі цяжка. Тата наш сапраўды загінуў — у 1943-м, яшчэ да таго, як я нарадзілася, мама — адна — як тая пчолка, дзень і ноч, у будні і святы шчыравала, каб нечым накарміць, у нешта адзець і абуць пяцёра дзяцей. Мы (у мяне было чатыры браты) ва ўсім стараліся дапамагчы ёй ды хоць нечым парадаваць: спачатку — добрай вучобай у школе, потым — поспехамі ў рабоце і заўсёды — сваім стаўленнем да людзей. Хіба некалькі прыкладаў.

Пасля ВНУ я займала хай сціплую, але ж пасаду ў райвыканкаме, мела свой кабінет. Неяк раніцай дзверы яго адчыняюцца, на парозе з'яўляецца высокі худы незнаёмец з пустым заплечнікам, кладзе на стол паперку з месяцаў зняволення, просіць дапамагчы ўладкавацца на работу.

— Іншых дакументаў няма? — пытаюся ў яго.

— Не, — бурчыць візіцёр.

Сітуацыя, вядома ж, складаная, нечаканая. Каб займець нейкі час на роздум ды пошук варыянтаў (мужчына паспеў расказаць, што начаваў у Мінску на вакзале, што сюды прыехаў першым аўтобусам), адпраўляю яго перакусіць, даю трохі грошай... Гэта ў доўг, маўляў, калі-небудзь з зарплаты аддасце.

...Так яно ўсё і выйшла — аддаў. А заплечнік, як расказала потым яго кватэрная гаспадыня, быў не пусты: у ім ляжала вялікая самаробная фінка, якая, дзякаваць богу, не спатрэбілася.

А неяк у кабінет зайшла бежанка з Абхазіі, у якой таксама не было нічога, а вось патрэб...

Зноў жа ўсё знайшлося — і жытло, і работа, і адзенне, і грошы — усё пашчасціла вырашыць! Прыжылася жанчына ў нашым раёне, і потым, колькі ні сустракаліся, заўсёды дзякавала. Што, вядома ж, прыемна. Але...

Не раз і не два дапамогі шукала і я сама: замалада (рэха вайны, ці што?) вельмі цяжка хварэла і хварэю, і калі б не медыкі...

Іх клопатам, іх працай я, дзякаваць богу, жыву. Дваццаць гадоў ужо на заслужаным адпачынку, усе дваццаць была старшынёй таварыства інвалідаў з усімі адсюль турботамі пра гуманітарную дапамогу, лекі, інвалідныя каляскі, дровы, падпіску на перыядычныя выданні, арганізацыю цікавых сустрэч...

Ды і цяпер па магчымасці клапачуся пра блізкіх і далёкіх, трымаю пчол і казу, вырошчваю гародніну. Рада, што хоць некага магу пачаставаць слоічкам мёду, для сябе ды іншых назбіраць ліпавага цвету, шыпшыны, глогу... Хобі ў мяне такое — пакуль жыву, рабіць дабро.

**Ніна Бурко,**
*Бярэзінскі раён.*

Праверана на сабе

# «ЛЯЧЭННЕ САПРАЎДЫ ЧАСАМ ЗДАЕЦЦА ЦЯЖКІМ...»

**Летась мы з мамай (ёй дзявяты дзясятак) перахварэлі на каранавірус, дзякаваць богу, у няцяжкай форме. Яе, той цяжкай, мы пастараліся не дапусціць, таму што лячэнне пачалі адразу, можна сказаць, з першых гадзін захворвання і ўсімі магчымымі сродкамі.**

Сярод іх перш-наперш частае піццё, мёд, лімон, ягады (чарніцы, буякі, журавіны), сырыя сокі морквы і капусты, яблыкі, часнок...

Аптэчныя вітаміны мы замянялі адварамі з дробненых круп (ячных, аўсяных, проса), якія ўтрымліваюць шмат магнію. Муку — і наогул, і пры каранавірусе ў прыватнасці — лепш ужываць іржаную шатроўку (калі пшанічную, то першага, другога гатункаў, дзе больш бялку і вітамінаў). З аптэчных лекаў пры моцных галаўных болях, болях за грудзінай, у мышцах і суставах прымянялі аспірын, зрэдку — папазол.

Дапамагалі сабе і травамі. У нашых аптэках у засушаным выглядзе і ў выглядзе настоек ёсць і правераныя часам рамонак, святаяннік, чабарок, календула, падарожнік, крываўнік (ён, дарэчы, сто гадоў таму спыніў халеру на Волзе: хто піў — не памёр), ліпавы цвет, вятроўнік (рус. — таволга)...

Гэтую траву мы з мамай збіралі здаўна. Расце яна каля рэк, на балотах. Цвіце ў маі-чэрвені. Кветачкі ў яе «венічкам», жаўтавата-белыя, дробныя... Якраз іх (карэнне мы збіраем радзей, бо шкада раслін) і прымяняем потым у лячэнні многіх хвароб. Для гэтага сталовую лыжку сыравіны заліваем шклянкай (250 грамаў) кіпеню, тры-чатыры хвіліны трымаем на маленькім агні, 40 хвілін настойваем, цэдзім і п'ём з цёплай вадой па тры-чатыры сталовыя лыжкі за 15 хвілін да яды. (Нагадаю, што пачынаць прымяненне новых лекаў лепш пасля размовы з доктарам і з паменшанай дозы, назіраючы потым за рэакцыяй арганізма. Вятроўнік, напрыклад, можа зніжаць ціск).

Ён жа, дарэчы, паспяхова лечыць не толькі прастудныя вірусныя захворванні, але і гастрыт з павышанай кіслотнасцю, піеланефрыт, гіпертанію, халецыстыт... Многія цяпер п'юць шмат лекаў, не грэбуюць алкаголем, часта ўжываюць не вельмі якасную ежу, а вятроўнік узмацняе здольнасць печані абясшкоджваць таксіны... Я шмат каму раю гэту траву. Праўда, у адказ часам чую, што таблеткі прымаць прасцей: не трэба, маўляў, нічога заварваць, настойваць, цадзіць...

Яшчэ знакаміты Парацэльс пісаў, што лячэнне і сапраўды часам здаецца цяжкім, але куды цяжэй давядзецца потым, калі праз гэтую ляноту (альбо — ад сябе дадам — пабочныя эфекты ад таблетак) запусціць хваробу... У гэтым выпадку стакроць павялічацца пакуты, а лячэнне будзе і даўжэйшым, і цяжэйшым.

Да гэтых слоў, па-мойму, нельга не прыслухацца. Дарэчы, нам з мамай у змаганні з каранавірусам паспрыяла яшчэ і тое, што кожны дзень у любое надвор'е мы бываем на вуліцы — не менш за тры кіламетры праходзім пехатой, умацоўваем свой імунітэт. Гэтага ж жадаем і іншым.

**Аляксандр Васільеў,**
*г. Віцебск.*

Запрашальнік

# НАСТУПНЫ ПРЫПЫНАК — ГАЛЬШАНЫ

**Куды звазіць вучняў на экскурсію? Дзе адшукаць новы цікавы маршрут? Гэтыя пытанні часта паўстаюць перад педагогамі і бацькамі, бо хочацца ж адкрыць штосьці новае, захапляльнае...**

Гальшаны — невялікае мястэчка на Ашмяншчыне — на першы погляд такое ж, як сотні іншых. Аднак розніца ёсць...

Жамчужынай населенага пункта з'яўляецца замак. У паўночнай вежы, адкрытай не так даўно пасля рэстаўрацыі, некалькі ўзроўняў, і на кожным свая экспазіцыя — безліч цікавых экспанатаў. Гэта і археалагічныя знаходкі, і гістарычныя дакументы, і элементы тагачаснага строю... Трапляючы сюды, апынаешся ў мінулым, адпаведна — лепш разумееш гісторыю, уяўляеш жыццё нашых продкаў.

Зачароўвае і аглядная пляцоўка. З вышыні птушынага палёту можна палюбавацца незвычайнай панарамай мястэчка: касцёлам, кляштарам, царквой святога Георгія... Будынак яе, узведзены ў 1901 годзе, звонку ўражвае сваёй узнёсласцю, а ўнутранае ўбранне — яшчэ і таямнічым характарам, пад уплывам якога забываюцца ўсе праблемы...

На працягу чатырох стагоддзяў упрыгожвае Гальшаны і касцёл святога Яна Хрысціцеля стары вадзяны млын. Тут даўно ўжо не мелюць муку, аднак ахвотныя могуць даведацца, як тое рабілася, пазнаёміцца з будынкам, зрабіць незвычайныя фотаздымкі.

Багаты на экспанаты і мясцовы гісторыка-краязнаўчы музей. У адной з яго залаў сіламі вучняў і дарослых мясцовых жыхароў сабраны ручнікі, посцілкі, вышываныя сукенкі, прасы, прадметы быту беларусаў, у другой — прадстаўлены археалагічныя знаходкі, памятныя манеты, у трэцяй — акцэнтуецца ўвага на падзеях Вялікай Айчыннай вайны.

Інакш кажучы, Гальшаны — свет досыць таямнічы і незвычайны. Ён інтрыгуе прывідамі Белай Панны і Чорнага Манаха, прымушае задумацца аб захаванні нашай гістарычнай спадчыны і нават... рыфмаваць:

*Гальшанскі замак — альфа і амега.*
*Квітнее праз стагоддзі даўніна.*
*Здаецца, павітае нас Сапега,*
*Сустрэне невядомая княжна...*

Так што прыязджайце!

**Марта Багдановіч,**
*г. Ашмяны.*

Усмешачку

# ЁСЦЬ ЛОГІКА!

Настаўніца:

— Дзеці, хто такі Спартак?

Вучні *(хорам)*:

— «Спартак» — чэмпіён!

***

— Пеця, чаму ты так дрэнна вучыш англійскую мову?

— А навошта?

— Як гэта навошта? На ёй гаворыць палова зямнога шара!

— І што? Хіба гэтага мала?

***

— Дзеці, што азначае фраза «Рэдкая птушка даляціць да сярэдзіны Дняпра»?

Вучань:

— А тое, што на сярэдзіне ракі нармальнай птушцы няма чаго рабіць.

**Сабрала Раіса Хвір,**
*г. Нясвіж.*

Наўздагон

# ДЗЕ КАЗА ХОДЗІЦЬ, ТАМ ЖЫТА РОДЗІЦЬ...

**Лічыцца, што самы кароткі месяц — люты, але ж і студзень неяк зусім не здоўжыўся, магчыма, таму, што ў ім вельмі шмат прыгожых свят. Не ведаю, як у іншых мясцінах, а ў нас і сёлета людзі дарослыя, а найбольш дзеці, хадзілі калядаваць, шчадраваць.**

Па ўсім відаць, што рыхтаваліся да гэтага загадзя: прыдумвалі касцюмы казы, мядзведзя, размалёўвалі твары, вучылі вершы-пажаданні:

*Каляда надышла!*
*Што ты, цётачка, спякла?*
*Дык вынось хутчэй,*
*Не марозь дзяцей!..*
*На новае лета*
*Столькі вам свінак,*
*Колькі асінак,*
*Столькі авечак,*
*Колькі ў нас рэчак!*

На жаль, не ўсё я запомніла, але ж парадавалася, што захоўваюцца народныя традыцыі, перадаюцца маладым пакаленням.

**Софія Атрохава,**
*Слуцкі раён.*

# «ПА ПЕСНІ ПАЗНАЕЦЦА НАЦЫЯ, ЯЕ ХАРАКТАР І ДУША»

**У гэтай гараджанкі не было вясковага дзяцінства, не было нават летніх канікул у бабулі ў вёсцы, бо тая жыла ў райцэнтры ў гарадской кватэры. Бацькі — фізікі па адукацыі — пазнаёміліся падчас вучобы на фізфаку БДУ. Іх дачка пасля заканчэння ліцэя таксама спыніла свой выбар на БДУ, паступіла на найпрэстыжнейшы ў моладзі факультэт міжнародных адносін, прычым хапіла балаў, каб трапіць на бюджэтную форму навучання. Але сёння яна займаецца... вывучэннем фальклору. Знаёмцеся: загадчыца сектара захавання фальклорнай спадчыны Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук, кандыдат філалагічных навук Яніна ГРЫНЕВІЧ.**



Яніна ГРЫНЕВІЧ: «Любая экспедыцыя — гэта найперш кантакт з чалавекам...»

Напрыканцы 2021 года наша суразмоўніца стала ўладальніцай прэміі акадэміка Усевалада Ігнатоўскага. Імянныя прэміі для маладых вучоных НАН былі заснаваны тры гады таму: гэта прэміі імя акадэмікаў Жарэса Алфёрава (у галіне фізікі, матэматыкі, інфарматыкі, фізіка-тэхнічных і тэхнічных навук), Васілія Купрэвіча (у галіне біялогіі, хіміі і навук аб Зямлі, медыцыны і аграрных навук) і першага прэзідэнта Акадэміі навук Усевалада Ігнатоўскага (у галіне гуманітарных і сацыяльных навук). Прэстыжнай узнагародай быў адзначаны яе цыкл работ «Песенная традыцыя беларусаў у сучасным славянскім свеце: вывучэнне, захаванне, актуалізацыя». Як маладая дзяўчына стала вядомай даследчыцай беларускага фальклору, яна расказала ў гутарцы з журналістам «Звязды».

## СІМВОЛІКА ЛІРЫЧНЫХ ТВОРАЎ

— Яшчэ падчас вучобы ў Беларускім дзяржаўным універсітэце я пачала задумвацца: а што далей? Прызнаюся, што не ўсе прадметы, што вывучала, былі мне цікавыя. Хацела працягнуць вучобу ў магістратуры, але толькі не на сваім факультэце, — расказвае Яніна. — Зацікавіў варыянт з магістратурай у Інстытуце падрыхтоўкі навуковых кадраў Нацыянальнай акадэміі навук. Выбар спыніўся на агульнагуманітарнай спецыяльнасці «Мастацтвазнаўства». А ў тым, што я абрала менавіта фалькларыстыку, у многім заслуга плённага збіральніка беларускага фальклору Арсеня Ліса. Я патэлефанавала яму, мы пагутарылі, і ён пагадзіўся быць маім навуковым кіраўніком спачатку ў магістратуры, а потым і ў аспірантуры. Арсень Ліс — выбітная асоба, мэтр фалькларыстыкі, у такога спецыяліста хочацца вучыцца...

У 2013 годзе Яніна скончыла аспірантуру, на працягу года дарабіла сваю навуковую працу, абаранілася і атрымала ступень кандыдата навук. Кажа, што займалася і працягвае займацца пазаабрадавымі лірычнымі песнямі. «Лірычныя песні — гэта сукупнасць песень, не прымеркаваных да абрадаў каляндарнага ці сямейнага цыкла. Да іх адносяцца любоўныя, сямейна-побытавыя і сацыяльна-побытавыя, а ў цэнтры лірычнага твора знаходзіцца асоба чалавека са сваім асабістым лёсам, доляй», — тлумачыць даследчыца.

У 2018 годзе ў выдавецкім доме «Беларуская навука» выйшла манаграфія Яніны Грыневіч «Беларускія пазаабрадавыя лірычныя песні». З яе можна даведацца пра семантыку і паэтыку вобразаў у песнях, іх вытокі і развіццё, у кнізе змешчаны таксама слоўнік мовы лірычных песень. Напрыклад, акрамя слова «кахаць», у песнях сустракаюцца сінонімы «любіць» і «куміцца», а адпаведнікі сучаснага «сустракацца» ў традыцыйнай лірыцы — гэта «любіцца» і «кахацца».

— Разгадванне сімволікі песень — надзвычай цікавая і даволі ўдзячная справа, калі памятаць пра кантэкст і шматзначнасць фальклорных вобразаў, — кажа Яніна Грыневіч. — Колькасны аналіз, праведзены на аснове класічнага зборніка беларускага песеннага фальклору «Лірычныя песні» (яго складальнікам быў Ніл Гілевіч), дэманструе цікавыя звесткі — паказвае, як часта тое ці іншае слова ўжываецца ў песнях. Дык вось на першым месцы па колькасці згадак — вобразы расліннага і жывёльнага свету. Часцей за вобразы іншых раслін у песнях сустракаецца каліна: яна ўвасабляе дзявоцкасць, дзявочую перадшлюбнага ўзросту, замужніцу, маці. Вобраз саду суадносіцца з родным, бацькоўскім домам. Поле, з аднаго боку, увасабляе акультураную, засвоеную чалавекам прастору, месца спатканняў і сустрэч, а з другога боку, звязана з іншасветам. У некаторых кантэкстах поле — станоўчы вобраз (яно шырокае, радзімае), а ў іншых, наадварот, поле нерадзімае, голае. У чыстае поле нярэдка выпраўляецца лірычная гераіня ў пошуках добрай долі...

Дарога ў песнях выступае месцам дзеяння, з ёй наўпрост звязаны матыў расстання. Таксама дарога сімвалізуе асабісты лёс і долю чалавека.

## ПАМІЖ ЗАХАДАМ І ЎСХОДАМ

Цікавімся ў Яніны, а як жа сёння адбываецца збіранне фальклору, бо носьбіты песеннай традыцыі паступова сыходзяць. Няўжо ў XXI стагоддзі яшчэ штосьці засталося па-за ўвагай даследчыкаў?

— Этнаграфічныя экспедыцыі ніхто не адмяняў, — усміхаецца даследчыца. — У мінулым годзе ў мяне было тры экспедыцыі. Ёсць ужо планы і на бягучы год. Канешне, у першую чаргу мяне цікавяць песні, але на іх не заўсёды шанцуе, таму запісваю ўсё, што можна «здабыць»: загадкі, прымаўкі, прыказкі, казкі, замовы і гэтак далей. Мяне цікавіць, што спяваюць у вёсках сёння фальклорныя калектывы, сямейныя дуэты, якія песні гучаць, калі людзі проста збіраюцца разам, каб адпачыць. Акрамя таго, я задаюся пытаннем, ці ўзнікаюць новыя песні. У апошнія гады сталі папулярнымі новыя святы — Дзень вёскі, Дзень пажылога чалавека. Людзі пачынаюць падладжваць фальклор пад новыя патрэбы, змяняюць, адаптуюць тэкст, мелодыю, хочуць быць больш сучаснымі. Гэта творчасць на мяжы аўтарскай і фальклорнай. Але ўсё адно цікава назіраць, куды рушыць народная творчасць. Шмат дзе ў апошнія гады аднаўляюць народныя абрады. Да нас у Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры часта звяртаюцца фальклорныя калектывы, створаныя пры сельскіх клубах, якія хочуць даведацца, а што спявалі раней у іх мясцовасці, бо песенная спадчына была страчаная. Яны імкнуцца прытрымлівацца аўтэнтычнай манеры выканання. Каб дапамагчы, мы звяртаемся да сабраных архіўных матэрыялаў. Дарэчы, **пры аддзеле фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў існуе Калекцыя фальклорных запісаў — самы стары і самы вялікі фальклорны архіў Беларусі, які быў створаны ў 1957 годзе. Ён па праве мае статус «нацыянальнага навуковага здабытку».**

«Любая экспедыцыя — гэта найперш кантакт з чалавекам, — заўважае Яніна. — Каб той табе раскрыўся, пачаў спяваць, трэба знайсці да яго падыход. Толькі калі табе давяраюць, можна пачуць вельмі шчырыя асабістыя гісторыі, напрыклад пра тое, што жанчыны спяваюць у адзіноце, калі застаюцца дома адны, для іх гэта своеасаблівы спосаб псіхалагічнай разгрузкі. Адна з жанчын мне расказала, што калі на душы становіцца зусім невыносна, яна ідзе ў лес і вые там... Калі размаўляеш з людзьмі і шукаеш падступу да песень, а яны не хочуць прызнавацца, што спяваюць, пытаешся: «А на пахаванні?» У адказ чуеш: «Ой, канешне...» Жанчын па-ранейшаму запрашаюць спяваць на пахаваннях. Гэта традыцыя ўсё яшчэ жывая. Вось так паступова, праз пахавальныя псалмы, і знаходзіш падыход да інфарманта.

Вельмі запомнілася нашай суразмоўніцы першая самастойная экспедыцыя ў вёску Мірная ў Рагачоўскім раёне. Яе жыхарка Надзея Адамаўна Швед пісала ў Акадэмію навук лісты, запрашала прыехаць да яе, бо яна «ўжо старая, хутка памрэ і яе песні сыдуць разам з ёй». «Я вучылася ў аспірантуры, і мяне адправілі ў Рагачоўскі раён, — расказвае Яніна. — Пасялілася я ў Надзеі Адамаўны, жыла там некалькі дзён, а яна ўвесь гэты час спявала: раніцай, днём, увечары і нават ноччу. Пад канец ужо амаль страціла голас, але трымалася да апошняга. І вось я збіраюся ад'язджаць, а Надзея Адамаўна, якой ужо было на той момант 90 гадоў, пажадала правесці мяне да маршруткі. Восень, халодны вецер, і тут яна кажа: «Слухай, а давай я табе яшчэ спяю». Проста неверагодная жанчына!

Хоць экспедыцыі звычайна не падобныя адна на адну. Пры выбары месца ацэньваеш загадзя свае перспектывы, рыхтуешся, глядзіш, што ўжо было сабрана папярэднікамі. Здараецца, што шмат чакаеш, але твае спадзяванні на песенны фальклор не спраўджваюцца. Тады запісваеш «этнабатаніку» (пад ёю маецца на ўвазе сістэма ведаў пра ўзаемаадносіны людзей і раслін), цікавішся тэкстылем, вышыўкай. Ці, наадварот, была ў 2020 годзе ў Свіслацкім раёне, на самай мяжы з Польшчай, нават не магла падумаць, што столькі песень там запішу. Да экспедыцыі паглядзела, што ёсць у нашым архіве з тых мясцін, пабачыла: у адной з вёсак запісвае песні Рыгор Шырма. Дык вось там яшчэ жывая памяць пра яго візіт — вяскоўцы паказалі хаты, дзе жылі тыя спевакі, падзяліліся ўспамінамі пра іх. Цікава, што мясцовы фальклорны калектыў «Спадчына» выконвае ў тым ліку і тыя самыя песні, запісаныя Шырмам». У Шчучынскім раёне таксама, у якую вёску мы ні заходзілі б, ва ўсіх спявалі. Лічу, што знайсці цікавае можна паўсюль, нават на Міншчыне, хоць існуе памылковае меркаванне, што тут ужо даўно ўсё вывучана.

Безумоўна, кожны рэгіён Беларусі мае свае асаблівасці: спецыфічныя абрады, гульні, прымеркаваныя да іх песенныя творы. Нярэдка яны ўваходзяць у рэестр нематэрыяльнай культурнай спадчыны і становяцца брэндам адпаведнай мясцовасці. А ўвогуле, **калі чуеш песню, то па мове заўсёды можна адрозніць, з якога яна рэгіёна».**

## «АПОШНІ КРЫК...»?

Некалькі гадоў таму ў рамках праекта «Tradycyja» быў падрыхтаваны дыск «Бяседныя песні». У ім сабраны застольныя песні з розных рэгіёнаў Беларусі з 1960-х гадоў да нашага часу. Усяго рэліз складаецца з 34 кампазіцый. Укладальніцай дыска стала Яніна Грыневіч.

— Бяседныя песні спявалі ў святочныя моманты, калі падчас застолляў збіралася сям'я, суседзі і знаёмыя. Іх рэгіянальныя назвы — застольныя, гасцявыя, п'яніцкія, карчомныя, банкетовыя, пірушачныя, кірмашовыя. Пра бяседныя песні казалі: «Як толькі адну чарачку вып'ю, і ўсё, пашло — вы сядзіце, а я буду песні пяяць», — расказвае даследчыца. — Бяседныя песні выконвалі, напрыклад, на застоллі ў гонар нараджэння дзіцяці, услаўлялі гасціннасць і шчодрасць гаспадароў, добры пачастунак. Спявалі пра развітанне з бесклапотным жыццём, велічалі маладых, жартавалі з дружкамі жаніха і нявесты на вясельным застоллі. Большасць застольных твораў паводле свайго зместу «жыццёвыя». У іх распавядалі пра жаночую долю, няспраўджаныя надзеі, нялюбага мужа. Вясёлыя і гумарыстычныя творы суседнічаюць з сумнымі, мінорнымі.

Летась нашай акадэмічнай камандай быў выпушчаны дыск «Віцебска-вележскія запісы». Мы запачаткавалі такую серыю, як аўтэнтычны фальклор беларускага памежжа. Песні, што ўвайшлі ў першы дыск, былі запісаны нашымі калегамі Галінай Барташэвіч і Канстанцінам Кабашнікавым падчас экспедыцыі ў 1989 годзе на беларуска-расійскай мяжы. Спачатку яе ўдзельнікі збіралі лірычныя творы на беларускім баку, а потым перайшлі на расійскі. Цікава было даведацца: а ці існуе гэтая мяжа? Дык вось жанчыны казалі: «Не, у нас спяваюць па-свойму, не так...», хоць запісаныя песні сведчылі, хутчэй, пра адваротнае.

Напрыканцы гутаркі мы запыталіся ў Яніны: «Цікава, а як вы глядзіце на будучыню фалькларыстыкі, бо ў часы глабалізацыі ўзнікае пагроза як агульнанацыянальнай, так і рэгіянальнай самабытнасці?»

**«Акрамя слова «кахаць», у песнях сустракаюцца сінонімы «любіць» і «куміцца» , а адпаведнікі сучаснага «сустракацца» ў традыцыйнай лірыцы — гэта «любіцца» і «кахацца».**

— Ведаеце, я займаюся гісторыяй фалькларыстыкі, сёлета ў мяне запланаваны выхад манаграфіі, прысвечанай Антону Грыневічу. Гэта вядомы збіральнік і папулярызатар беларускага музычнага фальклору пачатку XX стагоддзя, выдавец, педагог і кампазітар. У яго вельмі цікавы і трагічны лёс. Сам ён родам з Полаччыны. Жыў і працаваў у Пецярбургу, затым заснаваў прыватнае выдавецтва, збіраў і выдаваў беларускія песні.

З 1920 года Антон Грыневіч жыў у Вільні, дзе працаваў выкладчыкам спеваў у Віленскай беларускай гімназіі. Выдаў «Народны спеўнік» і «Школьны спеўнік». У 1921 годзе трапіў у турму за сваю грамадскую дзейнасць, пазней быў вызвалены пад нагляд паліцыі. А ў кастрычніку 1925 года нелегальна выехаў у Мінск. Працаваў сакратаром Песеннай камісіі ў Інстытуце беларускай культуры. Як і многія нацыянальныя дзеячы і прадстаўнікі навуковай эліты таго часу, **ён аднёсіў народную песню да найважнейшых этнавызначальных прыкмет, якія ў поўнай меры адлюстроўвалі ўнікальнасць, самабытнасць і адрозненне беларусаў ад іншых народаў.** «Як па тварі пазнаюць чалавека, так па песні, асабліва народнай, пазнаецца цэлая нацыя, яе характар і душа», — пісаў ён у 1912 годзе ў адным са сваіх артыкулаў.

А ў другой палове 1920-х гадоў у цэнтральным друку выходзіць артыкул Антона Грыневіча «Апошні крык паміраючай беларускай песні». Яму здавалася, што народная песня вось-вось знікне, можна не паспець яе запісаць. Але... прайшло сто гадоў, і песня не памерла! Цікавасць да фальклору не знікла! І я не бачу перадумоў для яе знікнення.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота з асабістага архіва гераіні.**

# Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

## ЯК ХАРЧАВАЦЦА ПАДЧАС ПАНДЭМІІ?

**Пандэмія COVID-19 змяніла штодзённае жыццё людзей ва ўсім свеце. На фоне гэтых змен важна падтрымліваць здаровы спосаб жыцця і адзін з найважнейшых яго элементаў — правільнае харчаванне.**

Здаровы рацыён мае вялікае значэнне для дзейнасці імуннай сістэмы. Вядома, што здаровае харчаванне забяспечвае засцярогу ад неінфекцыйных захворванняў, уключаючы дыябет, хваробы сэрца, інсульт і рак.

— Праведзены аналіз даных па захваральнасці, прадстаўленых Мінскай абласной клінічнай бальніцай, паказвае, што апошнія дзесяць гадоў адзначаецца рост колькасці ўпершыню зарэгістраваных захворванняў, звязаных непасрэдна ці ўскосна з праблемамі харчавання. Гэта ішэмічная хвароба сэрца, гіпертанічная хвароба, жалезадэфіцытная анемія, цукровы дыябет, хваробы стрававода, страўніка і дванаццаціперснай кішкі, — расказвае **урач-эпідэміёлаг Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Дар'я ДАНІЛОВІЧ**.

Нездаровае харчаванне і адсутнасць фізічнай актыўнасці з'яўляюцца асноўнымі рызыкамі для здароўя ва ўсім свеце. Ежа, якую мы спажываем, непасрэдна ўплывае на тое, як мы сябе адчуваем і як функцыянуе наш арганізм.

### ШТО ЗРАБІЦЬ, КАБ ЗАСТАВАЦЦА ЗДАРОВЫМІ?

*Для падтрымання здароўя неабходна выконваць наступныя прынцыпы здаровага харчавання:*

• Сілкуйцеся разнастайна. Спажывайце розныя прадукты як у рамках адной харчовай групы, так і з розных груп, каб забяспечыць дастатковую колькасць важных пажыўных рэчываў.

• Ешце больш садавіны і гародніны. Яны ўтрымліваюць мноства вітамінаў і мінералаў, а таксама клятчатку. Штодзённае спажыванне 400 г, або пяці порцый, садавіны і гародніны зніжае рызыку развіцця неінфекцыйных захворванняў і дапамагае забяспечыць штодзённае паступленне клятчаткі.

• Спажывайце бабовыя, арэхі і іншыя карысныя прадукты. Бабовыя, злакавыя, арэхі і карысныя тлушчы, такія як аліўкавы, кунжутны і іншыя віды нерафінаванага алею, умацоўваюць імунную сістэму і могуць спрыяць памяншэнню запаленчых працэсаў. Фасоль, гарох і іншыя бабовыя ўтрымліваюць вітаміны і мінералы, якія ў якасці кампанентаў здаровага рацыёну могуць зменшыць рызыку такіх захворванняў, як дыябет і парушэнні каранарнага кровазвароту.

• Абмяжуйце спажыванне тлушчаў, цукру і солі. У стане моцнага стрэсу многія людзі знаходзяць палёгку ў смачнай ежы. На жаль, яна часта ўтрымлівае вялікую колькасць тлушчаў, цукру, солі і калорый, што ў рамках незбалансаванай дыеты можа з часам паўплываць на стан здароўя. Вазьміце за правіла правяраць этыкеткі ўсіх прадуктаў, якія вы спажываеце, на прадмет інгрэдыентаў і харчовай каштоўнасці.

Харчовая маркіроўка існуе для таго, каб дапамагчы нам абмежаваць колькасць пэўных пажыўных рэчываў або павысіць узровень карысных інгрэдыентаў.

Выконвайце правілы гігіены харчавання. Яны асабліва важныя цяпер, падчас пандэміі. Нягледзячы на тое што COVID-19 выклікаецца рэспіраторным вірусам, заўсёды важна выконваць правілы гігіены і гарантаваць бяспеку харчовых прадуктаў. Запомніце пяць парад: вашы рукі, кухонныя прылады і паверхні павінны быць заўсёды чыстымі; трымайце асобна сырыя і прыгатаваныя прадукты; старанна выконвайце неабходны рэжым тэрмічнай апрацоўкі; захоўвайце ежу пры бяспечнай тэмпературы; выкарыстоўвайце бяспечную ваду.

Будзьце фізічна актыўныя і піце больш вады. Фізічная нагрузка важная для падтрымання як саматычнага, так і псіхічнага здароўя. Асабліва цяпер, калі людзі больш часу бавяць дома ў сувязі з пандэміяй COVID-19, важна знаходзіць альтэрнатыўныя спосабы падтрымліваць неабходны ўзровень актыўнасці. Пастаўце за мэту штодня аддаваць фізічным практыкаванням не менш за 30-60 хвілін, у залежнасці ад вашага ўзросту і спосабу жыцця.

Пытанне-адказ

# Хвароба, якая з'яўляецца галоўнай прычынай слепаты

**«Выпісваю і чытаю «Звязду» больш за 20 гадоў. Хацела б ведаць, якія вітамінныя прэпараты прымаць пры глаўкоме, каб спыніць гібель сятчаткі і зрокавага нерва? Два гады таму ў мяне захварэла правае вока, а цяпер і левае. Капаю кроплі «Брынзопт» і «Траваправэс», якія выпісвае ўрач, правяраю ўнутрывочны ціск. Раней, калі хварэла толькі правае вока, не бачыла вясёлкавых кругоў перад вачыма, а цяпер яны з'явіліся. Магчыма, урач мне штосьці параіць».**

*Раіса Фёдараўна, Мастоўскі раён.*



**Адказвае ўрач-афтальмолаг 11-й гарадской паліклінікі Галіна МІХНЕВІЧ.**

— Спачатку варта растлумачыць, што такое глаўкома. Гэта хранічнае, найчасцей двухбаковае захворванне вачэй, пры якім пастаянна або перыядычна павышаецца ўнутрывочны ціск, узнікаюць дэфекты ў полі зроку і з'яўляецца глаўкомная атрафія зрокавага нерва. У залежнасці ад таго, наколькі ён атрафіраваны, падзенне зроку можа быць аж да поўнай слепаты. Слепата, выкліканая глаўкомай, носіць незваротны характар, бо гіне зрокавы нерв. Вярнуць пацыенту ў такім выпадку зрок немагчыма! Пры гібелі валокнаў зрокавага нерва парушаецца правядзенне нервовых імпульсаў ад клетак сятчаткі ў мозг, і чалавек страчвае зрок.

На жаль, глаўкома даволі распаўсюджанае захворванне, часцей яго маюць людзі, старэйшыя за 40 гадоў, але могуць хварэць і маладыя людзі, і нават немаўляты.

Цяпер пра тое, навошта нам кантраляваць унутрывочны ціск. Чалавечае вока з'яўляецца замкнёнай поласцю, у якой адбываецца пастаянны працэс абмену ўнутрывочнай вадкасці, якая адказвае за падтрыманне ўнутрывочнага ціску і сілкавання хрусталіка і рагавіцы. Утвараецца ўнутрывочная вадкасць у адростку раснічнага цела і цыркулюе ў воку з задняй камеры ў пярэднюю. У здаровым воку назіраецца строгі баланс паміж выпрацоўкай унутрывочнай вадкасці і яе адтокам, што і вызначае тонус, або ўнутрывочны ціск. У воку ён выконвае важныя функцыі: пад яго дзеяннем выпростваюцца ўнутрывочныя абалонкі, у іх ствараюцца тонус і пругкасць, што неабходна для нармальнага функцыянавання вачэй.

Унутрывочны ціск павышаецца ў выніку дзвюх прычын: залішняй выпрацоўкі ўнутрывочнай вадкасці або парушэння адтоку ўнутрывочнай вадкасці праз дрэнажныя сістэмы.

Такім чынам, затрымка ў воку ўнутрывочнай вадкасці прыводзіць да павышэння ўнутрывочнага ціску, а яно — да парушэнняў у зрокавым нерве (гібель клетак зрокавага нерва), што вядзе да незваротнай страты зроку. Высокі ўнутрывочны ціск таксама спрыяе пашкоджванню асобных участкаў сятчаткі, якія ўспрымаюць святло.

Для глаўкомы характэрныя тры асноўныя прыкметы. Гэта павышэнне ўнутрывочнага ціску, звужэнне палёў зроку, змена дыска зрокавага нерва.

Трэба сказаць, што ў 80 % выпадкаў глаўкома працякае бессімптомна і толькі ў 20 % — са скаргамі на перыядычнае затуманьванне зроку, з'яўленне вясёлкавых кругоў перад вачыма (на што і скардзіцца чытачка), звужэнне поля зроку, болі ў воку (могуць быць уначы), болі ў лобнай, скроневай частцы галавы, пагаршэнне здольнасці бачыць прыцемкам, адчуванне дыскамфорту, цяжару ў воку.

### ГЛАЎКОМА МОЖА БЫЦЬ:

— *прыроджаная* (гэта спадчыннае захворванне, якое з'яўляецца вынікам няправільнага або няпоўнага развіцця дрэнажных канальчыкаў вока ў перыяд унутрывантробнага развіцця);

